РАДЫЕ у гадз. ночы:

КРАСНАДАР, 24. Кубанскім АДПУ выкрыта і ліквідавана контр-рэвалюцыйная бандыцкая арганізацыя, на чале якой стаяў юрысты Савіцкі—былы нам. старшыні Кубанскай краёвай рады, які кіраваў у 1921 г. паўстаньнем на Кубані. Актыўныя ўдзельнікі арганізацыі прыгавораны да расстрэлу. Прыгавар выкананы.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 245 (3353) Пятніца, 25 кастрычніка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

навіны **Б. С. С. Р.**

40 проц. зямлі--пад калгасамі

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). На тэрыторыі раёну яшчэ арганізаваліся 3 буйныя калгасы на плошчы 15 тысяч гэктараў.

Такім чынам, на Клімаўшчыне ўсяго калектывізавана 46 тысяч гэктараў зямлі ці 40 проц. агульнай плошчы.

З выступленьня т. Васілевіча

на ўсебеларускай нарадзе сакратароў ячэек КП(б)Б калгасаў і саўгасаў

Таварышы! Вы пастаўлены на важнейшы і найбольш трудны вучастак сацыялістычнага будаўніцтва. У сваёй штодзённай працы вы знаходзіцеся ў акружэньні дробна-буржуазнай масы. Буржуазная, кулацкая частка вёскі актыўна выступае супроць сацыялістычнага перабудаваньня вёскі. У абставінах, у якіх вы працуеце, работа надта складаная і будзе ўскладняцца, бо чым далей, тым размах сацыялістычнага будаўніцтва будзе пашырацца, а клясавая барацьба абвастраецца і ца бліжэйшым этапе будзе абвастрацца ў выніку нашага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элемэнты.

Вялікую ролю ў гэтай абстаноўцы адыгрывае сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі. На камуністых, якія працуюць у калгасах і саўгасах, прыпадае вялікая адказнасьць. Вы ў сябе павінны злучыць дзьве якасьці—**быць арганізатарамі сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і барацьбітамі за генэральную лінію партыі.** Мы ня можам правядзіць сацыялістычнага будаўніцтва без таго, каб ня весьці штодзенную барацьбу за генэральную лінію партыі. Калі-ж вы будзеце толькі **падзяляцку** падыходзіць да справы, вы ўпусьціце пытаньні клясавае барацьбы, барацьбы за генэральную лінію партыі, барацьбы з правямі ў тэорыі і на практыцы правага ўхілу, «левымі» заскокамі, барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, шавінізмам усіх колераў і антысэмітызмам.

У сваёй працы вы сустракаецеся і з такімі «партыйцамі» і «камсамольцамі», якія супроць калектывізацыі, супроць сацыялістычнага перабудаваньня вёскі і такімі, якія прымірэнча адносяцца да праяў правага ўхілу, або «левых» заскокаў, беларускага нацыянал-дэмакратызму, усялякага шавінізму і антысэмітызму. Яны аб'ектыўна перашкаджаюць весьці барацьбу з нашымі клясавымі ворагамі, яны аб'ектыўна перашкаджаюць сацыялістычнаму будаўніцтву і таму самая рашучая барацьба з людзьмі, якія зьяўляюцца насіцелямі такіх настрояў і прымірэнцтва,—адна з асноўных нашых задач.

Кулак скарыстоўвае ўсе сродкі для барацьбы з партыяй, рабочай клясай, бядняцтвам і серадняцтвам, якое ідзе сумесна з беднатой. Ён, кулак, зьяўляючыся адным з харчавальнікаў антысэмітызму, шавінізмаў, нацыянал-дэмакратызму, як мага выкарыстоўвае гэтыя сродкі ў сваёй барацьбе супроць генэральнай лініі партыі, супроць савецкае ўлады, падмацоўваючы гэтыя сродкі тэрорам.

Трэба цьвёрда памятаць, што дзяляцкі падыход да працы, небальшавіцкі падыход і сёньня зьяўляецца асабліва шкодным. Сёньня той ня можа стаяць ля партыйнага кіраўніцтва, хто не разумее, што нельга складаць і выконваць пляны сацыялістычнага, у тым ліку калгаснага і саўгаснага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва бяз шчыльнай увязкі з бязьлітаснай барацьбой з кулаком і нэпманам, усімі шавіністымі і ў першую чаргу, на даным этапе, з беларускімі нацыянал-дэмакратамі, антысэмітамі, бяз шчыльнай увязкі з бязьлітаснай барацьбой з правай апазыцыяй унутры партыі і «левымі» заскокамі і прымірэнцамі да іх. Гэту барацьбу ды будаўніцтва трэба весьці адначасова і рашуча. Усе гэтыя задачы складаюць непарыўнае цэлае. Толькі ў штодзённай працы, вырашаючы ўсе гэтыя задачы, толькі мабілізуючы масы працоўных, арганізуючы іх актыўнасьць, карыстаючыся сацыялістычным спаборніцтвам, як мэтадам працы, разгортваючы ўнутрыпартыйную дэмакратыю і шырокую самакрытыку, можна будаваць і пабудаваць сацыялізм.

Партыя арганізавала моцныя ўдары па правых ухілістых, антысэмітах, шавіністых, нацыянал-дэмакратах, глушыцелях самакрытыкі, бюракратах і розных шкодніках. Але-ж хаця харчовая база іх і звужваецца ў выніку нашага сацыялістычнага наступленьня, але капіталістычныя элемэнты яшчэ не разьбіты да канца, яны, адчуваючы няўхільнасьць паражэньня і пагібелі, будуць узмацняць актыўнасьць, **а таму нам трэба трымаць адточанай зброю барацьбы.**

Самакрытыка, сацыялістычнае спаборніцтва ахапілі шырокія масы працоўных. Але таму, што гэта не кароткатэрміновая кампанія, а сродкі актывізацыі мас, добраякаснасьці працы і мэтад працы ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва, трэба з усёй пільнасьцю і энэргіяй трымаць увесь час на вышыні шырока разгорнутую самакрытыку і сацыялістычнае спаборніцтва.

Карныя мерапрыемствы не зьяўляюцца асноўным мэтадам працы. Ленінскае марксыцкае выхаваньне на падставе штодзённай барацьбы—галоўная задача партыі і асноўны мэтад усёй работы. Павышэньне культурнасьці, ведаў працоўных мас, у першую чаргу членаў партыі і камсамолу, інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных—гэта задачы, якія трэба вырашаць адначасова з раней памянёнымі задачамі. Асабліва тэрмінова патрэбен рашучы пералом у справе інтэрнацыянальнага выхаваньня. На вырашэньне гэтай задачы ў сучасны момант трэба накіраваць усю энэргію нашых апаратаў і саміх працоўных мас.

Партыйная арганізацыя Беларусі—здаровая, моцная, вытрыманая, бальшавіцкі загартаваная арганізацыя. Але-ж у арганізацыі ёсьць праслойка, праўда нязначная, яшчэ невыстарчальна бальшавіцкі загартаваная. Гэта праслойка складаецца, галоўным чынам, з тых таварышоў, якія вышлі не з пралетарскага асяродзішча і якія нясуць на сабе груз няжыстых перажыткаў дробна-буржуазнага, нацыянальнага адраджэнцтва. У нашых умовах, калі дробна-буржуазнае акружэньне вельмі моцнае, пытаньне бальшавіцкага выхаваньня членаў партыі, перамога асобнымі членамі партыі перажыткаў іх дробна-буржуазнага мінулага да канца, набывае актуальнейшае значэньне. Зразумела, што пры гэтым адзінкі зьявяцца безнадзейнымі і іх трэба будзе адсеяць.

Пры абвостранай клясавай барацьбе, пры разгортваньні фашысцкіх арганізацый у Заходняй Беларусі, на чале якіх сталі беларускія нацыянал-дэмакраты, хістаньні асобных членаў партыі зараз-жа скарыстоўваюцца клясавымі ворагамі ў нас і за межамі ў сваіх мэтах, для барацьбы з савецкай дзяржавай. Таму трэба памятаць, што кожны крок адыходу ад генэральнай лініі партыі—ёсьць дапамога буржуазіі. Трэба тым, хто не канчаткова заблытаўся, тэрмінова зрабіць належныя вывады, яны павінны самі дапячэнту разьбіць і рашуча асудзіць свае «тэорыі». Трэба хутчэй, а то будзе позна, выбіраць—ці ўдзельнічаць у будаўніцтве сацыялізму, ці аддаць сябе на скарыстаньне буржуазіі.

У гэтай барацьбе за пабудову сацыялізму ў нашай савецкай краіне партыя павінна знайсьці ў вас адданых арганізатараў, будаўнікоў і барацьбітоў. Дазвольце-ж пажадаць вам, таварышы, ад імя ЦК КП(б)Б, каб вы сваёй працай апраўдалі надзеі партыі і былі стойкімі арганізатарамі, барацьбітамі, энтузіястымі сацыялістычнага перабудаваньня вёскі.

ЖОРСТКІЯ КЛЯСАВЫЯ БАІ НА ЗАХАДЗЕ

Перад усеагульнай забастоўкай гарнякоў у Польшчы

Масавымі арыштамі--урад ачышчае поле для здрадніцкай дзейнасьці ППС

ВАРШАВА, 24. Становішча ў польскіх каменна - вугальных басэйнах становіцца з кожным днём усё больш сур'ёзным. Дэлегацкія сходы гарнякоў **адхіляюць прыбаўкі ў 3 і 4 проц.**, якія прапануюцца арбітражнай камісіяй і капальняўласьнікамі для розных раёнаў.

Дэлегацкі сход левага крыла прафсаюза з удзелам 50 дэлегатаў, якія прадстаўлялі ўсе тры каменнаву гальныя раёны Польшчы (Дамброўскі, Верхня-Сілезкі і Кракаўскі), **ухваліў рэзалюцыю за агалашэньне ўсеагульнай забастоўкі.**

Паўторная прапанова капальняўласьнікаў аб прыбаўцы 5 проц. была таксама адхілена прадстаўнікамі прафсаюзу.

З прычыны рашучых настрояў гарнякоў пэнэсэаўцам прыходзіцца на гэты раз манэўраваць з асабліваю асьцярожнасьцю. Таму, у той час як старшыня пэнэсэаўскага прафсаюза Станчык знайшоў патрэбным выказацца ў друку за забастоўку, пэнэсэаўцы за кулісамі ўжываюць рашуча ўсе сілы для таго, каб сарваць забастоўку. Урад, робячы націск на пэнэсэаўцаў, заяўляе, што ён будзе разглядаць забастоўку, як палітычнае выступленьне, а для таго, каб пашырыць поле для здрадніцкай дзейнасьці пэнэсэаўцаў, улада прыступіла да масавых арыштаў рабочых і дзелчоў левага прафруху ў каменнавугальных раёнах.

Рэфармістыя сарвалі забастоўку бэльгійскіх гарнякоў

ПАРЫЖЖ, 23. Забастоўка бэльгійскіх гарнякоў у вугальным басэйне Орыпаш сарвана рэфармісцкімі лідэрамі. Забастоўка сарвана ў выніку розных манэўраў рэфармістых, накіраваных да таго, каб прымусіць гарнякоў прызнаць прынятую рэфармістымі пастанову зьмешанай ўзгаднальнай камісіі аб павышэньні заработнай платы ўсяго на 3-6 проц., у той час, як рабочыя аднадушна патрабавалі павышэньня зарплаты на 10 проц. Пастанова аб спыненьні забастоўкі прынята на скліканым рэфармістымі дэлегацкім сходзе, на якім прымала ўдзел каля 800 гарнякоў. Грузчыкі, якія пачалі забастоўку і ўвесь час былі на чале яе, на гэтым сходзе мелі вельмі мала прадстаўнікоў. Рэфармістыя правялі сход у духу шалёнага цкаваньня камуністых і ўжывалі адкрыты шантаж з мэтаю запалохаць рабочых. Дэлегаты грузчыкаў у знак пратэсту супроць задушэньня забастоўкі дэманстраўльна пакінулі сход яшчэ да галасаваньня пытаньня, ці працягваць забастоўку.

Камуністычны орган «Драпо Руж» асуджае гэтыя паводзіны грузчыкаў, зазначаючы, што яны павінны былі змагацца з рэфармістымі да канца і канчаткова выкрыць іх. Грузчыкі, якіх у Арынажы звыш 3.000, рыхтуюцца да адпаўленьня барацьбы. Бэльгійская кампартыя заклікае ўсіх гарнякоў не здаваць прадпрыемцам і рэфармістым і адпавіць барацьбу пад кіраўніцтвам кампартыі. Партыя заклікае гарнякоў выступіць згуртавана на дэманстрацыі, якая заўтра адбудзецца.

***

НОРД-ПЛАТЭ, 23. Сёньня самалёт «Краіна Саветаў» прыляцеў у Норд-Платэ (Небраска) праз Чэйэн (Паўднёвая Дакота). Напярэдадні зрабіў пасадку ў горадзе Салёнае Возера (Утах), з прычыны атрыманага па радыё паведамленьня аб сьнежным буране ў Чэйенскіх гарах. 2000 кілёмэтраў ад Сан-Францыска да Норд-Платэ, праз горы вышынёю да 3-х кілёмэтраў, самалётам пакрыты ў 13 гадзін. 24-га кастрычніка самалёт вылятае ў Чыкага.

Усеагульная канфэдэрацыя працы Італіі парывае з Амстэрдамскім інтэрнацыянапам

БЭРЛІН, 20. Паводле атрыманых вестак 12-14 кастрычніка ў Італіі адбыўся зьезд усеагульнай канфэдэрацыі працы Італіі. Паседжаньні зьезду адбываліся нелегальна, з прычыны фашысцкага тэрору. Пасьля ажыўленых спрэчак зьезд аднагалосна прыняў рэзалюцыю, якая ўхваляе разрыў усеагульнай канфэдэрацыі працы Італіі з амстрэдамскім інтэрнацыяналам. На зьезьдзе выступіў з прывітаньнем прадстаўнік чырвонага Прафінтэрну. (ТАСС).

Зьезд рэвалюцыйнай меншасьці прафсаюзаў Нямеччыны

БЭРЛІН, 23. Зьезд рэвалюцыйнай меншасьці прафсаюзаў назначаны на 1-га сьнежня ў Бэрліне. У ім прымуць удзел дэлегаты, абраныя на прадпрыемствах, прадстаўнікі арганізацый, выключаных з рэфармісцкіх прафсаюзаў, а таксама дэлегаты ад беспрацоўных і рэвалюцыйнага прафруху. Скліканьне зьезду спаткана з боку рэфармістых жорсткай кампаніяй. Левая меншасьць і рэвалюцыйна настроеныя пласты рабочых з захапленьнем вітаюць скліканьне зьезду. Судзячы па падрыхтоўцы да зьезду, у ім прыме ўдзел звыш 1.000 дэлегатаў. (ТАСС).

Барацьба за легалізацыю Чырвонага саюзу франтавікоў

БЭРЛІН, 21. Гэтымі днямі ў пралетарскім раёне Берліна Вэдзінгу адбыўся ўстаноўчы сход камітэту барацьбы за легалізацыю чырвонага саюзу франтавікоў. Сход быў вельмі шматлюдны. Да камітэту далучыліся прадстаўнікі некалькіх пралетарскіх арганізацый, а таксама дэлегаты ад прадпрыемстваў усеагульнай кампаніі электрычнасьці.

У адказ на тыдзень вярбоўкі, які праводзяць фашыстыя, забаронены чырвоны саюз франтавікоў наладзіў у Бэрліне 5 паходаў у рабочых кварталах. Рабочыя з захапленьнем віталі чырвоных франтавікоў, якія маршыравалі ў форменай вопратцы. Паліцыя разагнала паход. (ТАСС).

СЕНЬНЯ У МАСКВУ АДПРАЎЛЯЕЦЦА ПЕРШЫ ЧЫРВОНЫ ЭШАЛЁН З БУЛЬБАЙ

КАЛГАСЫ І ПРАЦОЎНАЕ СЯЛЯНСТВА БССР АРГАНІЗУЮЦЬ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ

Адгрузку бульбы для Масквы і Ленінграду выканаем у тэрмін

Сёньня адпраўляецца першы эшалён

Сёньня а 12-й гадзіне дня з Менску павінен адправіцца ў Маскву першы чырвоны эшалён з бульбай саўгасаў Менскай акругі. У склад эшалёну ўваходзіць 50 вагонаў.

Чыгункай былі прыняты неабходныя меры, каб гэты эшалён адправіць своячасова. Учора на станцыі Беларусь было пагружана 10 вагонаў, на ст. Фаніпаль—3 вагоны. Трэба думаць, што ў мінулую ноч і сёньня раніцою будзе пагружана і рэшта вагонаў на ст. Беларусь, Фаніпаль і Рудзенск.

Белсельтрэст учора яшчэ прыняў меры, каб узмацніць падвоз бульбы да вызначаных станцый і пагрузіць яе ў вагоны.

Трэба меркаваць, што сёньня першы эшалён адыйдзе ў Маскву.

Другі эшалён адпраўляецца 26-га

Белсельтрэст заканчвае падвоз бульбы саўгасаў, якія знаходзяцца ў Слуцкім раёне, да ст. Слуцак. Заўтра на ст. Слуцак падаюцца вагоны. Па даных Белсельтрэсту і чыгункі гэты эшалён адправіцца ў Маскву ў вызначаны тэрмін—26-га кастрычніка.

Падвоз бульбы для трэцяга эшалёну

26-га з Менску павінен адыйсьці ў Ленінград трэці чырвоны эшалён. Гэты эшалён зборны—з бульбай саўгасаў, с.-г каапэрацыі і калгасаў.

Усе арганізацыі пачалі ўжо падвоз бульбы па станцыях Менскай акругі да пагрузкі ў гэты эшалён. У Рудзенску сёньня будуць грузіцца 20 вагонаў, у Пухавічах 5, у Тальцы 2, у Ратамцы—10 і ў Менску—10. У Менску пагрузка бульбы для гэтага эшалёну пачалася яшчэ ўчора.

Чацьверты эшалён павінен адыйсьці своячасова

Як вядома, чацьверты эшалён адпраўляецца са станцыі Ворша сёньня ў Ленінград. Гэты эшалён вязе бульбу выключна беларускай сьпірытусовай прамысловасьці. Белдзяржсьпірт загадзя прыняў крокі да своячасовага падвозу бульбы з заводаў да станцый Багушэўская, Ходасы і Цёмны Лес. Аднак, відаць ён адчувае пекаторыя цяжкасьці з транспартам. З гэтай прычыны ён прасіў нават адтэрмінаваць на суткі адпраўку эшалёну.

Вагоны былі паданы на ст. Багушэўская, Цёмны Лес і Ходасы учора раніцою. Белдзяржсьпірт учора прыняў рашучыя крокі ў тым напрамку, каб падвоз і пагрузка бульбы былі ўсё-ж скончаны своячасова.

Ёсьць падставы меркаваць, што і гэты эшалён адыйдзе сёньня ў Ленінград, гледзячы на цяжкасьці, якія адчуваліся.

Бесьперабойныя перавозкі бульбы забясьпечаны

Учора ў Менск прыехаў начальнік 3-га аддзяленьня МВБ чыг. т. Майсечык, які зьяўляецца ўпаўнаважаным па перавозцы бульбы. У гутарцы з нашым супрацоўнікам ён паведаміў, што ў якіх перашкод да своячасовай падачы вагонаў для пагрузкі бульбы, а таксама да складаньня 3-мі чырвоных эшалёнаў, няма. Усе заяўкі арганізацый на падачу вагонаў выконваюцца своячасова.

Першыя эшалёны з бульбаю павінуць спэцыяльныя прыстаны на нашым вучастках паравозы, якія могуць пацягнуць 50 вагонаў грузу.

Магілеўшчына адгрузіла 235 вагонаў

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.). Па Магілеўшчыне шырока разгарнулася работа па загатоўцы бульбы. Да 24-га кастрычніка з акругі адгружана ў Маскву, Ленінград і Мурманск 235 вагонаў бульбы. Асабліва шмат бульбы загатоўлена за апошнія дні. Калгасаюз за два дні падрыхтаваў 32 вагоны бульбы, Белсельсаюз—33 і спажывецкая каапэрацыя — 3 вагонаў. 28-га кастрычніка акркалгасаюз адпраўляе ў Маскву адзін эшалён бульбы.

Арганізавана здаюць лішкі бульбы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Бядняцка-серадняцкая частка сялянства жыва адгукнулася на заклік партыі і ўраду аб тым, каб узмацніць загатоўкі бульбы.

Ва многіх вёсках працоўнае насельніцтва пачало арганізаваным парадкам здаваць каапэрацыі лішкі бульбы. За 22-ое кастрычніка на загатоўчыя пункты акругі дастаўлена больш за 60 тысяч пудоў бульбы.

30 калгасаў абавязаліся здаць 80 тысяч пудоў.

Ужо адгружаны першыя вагоны на Ленінград.

Загатоўкі бульбы ўзмацніліся

Па інфармацыі з месц відаць, што пляны загатовак бульбы даведзены ўжо да сяла.

У мэтах захаваньня бульбы ад псаваньня Белкаапсаюзам даны суровыя дырэктывы аб парадку хаваньня бульбы.

Адносна чырвоных эшалёнаў паступілі весткі, што на ст. Рудзенск і Смалявічы ўжо падвезена больш бульбы, чым патрэбна для адпраўкі эшалёнамі. Так, у Смалявічах, замест 20 вагонаў, ужо загатоўлена 40 вагонаў. У Рудзенску, замест 10 вагонаў, падвезена 17 вагонаў бульбы.

З Віцебску паведамляюць аб адпраўцы 26-га кастрычніка 120 вагонаў бульбы ў Ленінград і Маскву.

У сувязі з надзвычайна хуткім разгортваньнем загатовак бульбы, адчуваецца недахват грашовых сродкаў. Трэба ў тэрміновым парадку адпусьціць матэвыя крэдыты для забесьпячэньня ўзмоцненых загатовак бульбы.

З усіх акруг паступаюць тэлеграфныя весткі аб тым, што падвоз бульбы набыў такія вялікія разьмеры, што ёсьць небясьпека несваячасовай падачы вагонаў.

***

Як нам паведамілі ў акрагандлі, спажывецкая і сельска-гаспадарчая каапэрацыя свае заданьні аб арганізацыі чырвоных эшалёнаў выконвае поўнасьцю.

Гэтымі днямі ў Менск прыбываюць чырвоныя абозы з бульбай для патрэб МІРК і вайсковых часьцей. З Плешчаніц паступілі весткі, што там арганізаваны чырвоны абоз у 16 тысяч пудоў бульбы, які гэтымі днямі прыйдзе ў Барысаў. Чырвоныя абозы з бульбай арганізуюцца амаль ва ўсіх раёнах.

Зьнізіць сабекошт прадукцыі на 10 проц.

Беларуская рэспубліканская прамысловасьць павінна будзе ў гэтым годзе зьнізіць сабекошт прадукцыі на 10 проц. (у сярэднім).

Гэта павінна даць беларускай прамысловасьці **вельмі значнае накапленьне** для выканаьня пляну капітальных работ у 1929-30 годзе, які (плян) выражаецца ў вялікай суме **ў 52 мільёны рублёў.** Такім чынам, усякае недавыканаьне зьніжэньня сабекошту пагражае невыкананьнем пляну капітальных работ. Гэта таму, што пабудова ўсяго фінансавага пляну прамысловасьці выходзіць з запраектаванага разьмеру сабекошту.

Для выканаьня гэтай нялёгкай задачы, якая ўскладаецца ў гэтым годзе на нашу прамысловасьць, трэба зараз-жа перагледзець усе паказальнікі рэспубліканскай прамысловасьці—мэтады работы, нормы выдачы сыр-цу, колькасьць рабочых, магчымае павялічэньне прадукцыйнасьці працы, рацыяналізацыя вытворчасьці, узмацненьне нагрузкі саміх прадпрыемстваў,—усе гэтыя паказальнікі ў тэй ці іншай ступені зьвязаны з тэмпам зьніжэньня сабекошту.

Мэтад квартальных кулькуляцый, які практыкаваўся да гэтага году, не даваў кіруючым органам прамысловасьці своячасова і ў тэрмін улічваць балючыя, «вузкія» месцы. У гэтым годзе ўводзіцца новы мэтад прадстаўленьня штомесячных калькуляцый—гэта будуць зводкі з баявога фронту (бо зьніжэньне сабекошту—гэта баявая задача дня), якія дадуць мажлівасьць штабу нашай прамысловасьці аглядаць усе балючыя, пагражаючыя месцы, дзе трэба даць указаньне, дзе трэба націснуць, а то і моцна ўдарыць па нядбайнасьці.

Трэсты ўжо атрымалі ад ВСНГБ кантрольныя лічбы па зьніжэньні сабекошту, і цяпер ім трэба разьмеркаваць іх на сваіх прадпрыемствах. Па кожным заводзе, па кожным паасобным цэху трэба распрацаваць і правесьці ў жыцьцё мерапрыемствы, якія ў выніку дадуць поўнае выканаьне ўстаноўленага разьмеру зьніжэньня.

Трэба сказаць, што **мэтад бесьперапыннай вытворчасьці,** на які ўжо ў гэтым годзе пяройдуць многія беларускія прадпрыемствы, таксама **дасьць зьніжэньне сабекошту прадукцыі**—праведзеныя разьлікі гавораць, што **па тарфяной прамысловасьці** перавод на бесьперапынную **дасьць зьніжэньне на 1,4 проц., па шкляной прамысловасьці—на 2 проц.** (у сярэднім) і г. д.

Але ўсе гэтыя мерапрыемствы і новыя мэтады работы дадуць патрэбныя вынікі толькі пры тэй умове, што **да пытаньня зьніжэньня сабекошту будзе прыцягнута ў максымальнай ступені ўвага ўсяго заводзкага калектыву, усіх рабочых мас.** А для гэтага пытаньні зьніжэньня сабекошту павінны **сыстэматычна ставіцца на вытворчых нарадах,** яны павінны **ўсебакова асьвятляцца ў насьценгазэтах.** Калькуляцыі сабекошту трэба вывешваць на прадпрыемствах, каб рабочыя мелі мажлівасьць падрабязна з імі знаёміцца і ўносіць свае карэктывы. **Справу калькуляцый трэба перанесьці з габінэтаў бухгальтароў і калькулятараў бліжэй да калектыву рабочых.**

Наогул кіраўніком трэстаў і асобных прадпрыемстваў трэба моцна запомніць, што патрабаваньне аб 10-ці-процантным зьніжэньні сабекошту зьяўляецца катэгарычным—тут ніякія тлумачэньні, ніякія матывы ня будуць прымацца пад увагу. І яшчэ адно—кожнае прадпрыемства, кожнага кіраўніка прадпрыемства, кожную вытворчую ячэйку мы будзем расцэньваць на падставе таго, як імі будзе выконвацца дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

Генэральская вайна ў Кітаі

Ен Сі-шан захоўвае „нэйтралітэт"

ШАНХАЙ, 23. Напярэдадні афіцыйным паведамленьням аб тым, што жалезная дывізія Чан Фа-гуя была некалькі разоў разьбіта ўрадавымі войскамі, агенцтва Рэйтэр паведамляе, што армія Чан Фа-гуя канцэнтруецца ў паўночнай частцы правінцыі Гуанькі, недалёка ад мяжы з правінцыяй Хунань і рыхтуецца да паходу ў глыбіню правінцыі Гуанькі.

Агенцтва Сін-Бун-Рэнга паведамляе, што сілы Гоміньдзюня, якія стаяць фронтам уздоўж Лунхайскай чыгункі, заключылі кампрамісную згоду з камандуючым урадавымі сіламі правінцыі Хэнань генэралам Тан Шэн-чы.

У адказ на заклік манчжурскіх улад безагаворачна стаць на бок Нанкіна, Ен Сі-шан адмовіўся зьвязаць сябе з якой небудзь партыяй і пацьвердзіў, што будзе захоўваць поўны нэйтралітэт. Ён Сі-шан таксама паслаў тэлеграму Чан Кай-шы, у якой адмаўляецца ад прапанаванае яму пасады камандуючага ўсімі сіламі, якія дзейнічаюць супроць Гоміньдзюня.

Хваляваньні ў Пэйпіне

ПЭЙПІН, 23. Паліцыя арыштавала звыш 600 рыкш, абвінавачваючы іх у падбухторваньні да хваляваньняў. Прафсаюз рыкш і ўсе яго аддзяленьні закрыты. Трамвайная кампанія пастанавіла спыніць трамвайны рух у горадзе, пакуль пэйпінскія ўлады не дадуць ёй гарантыі абароны яе маемасьці. У выніку учарашніх хваляваньняў сапсавана каля 70 трамвайных вагонаў. Страты трамвайнай кампаніі вылічваюцца ў 400.000 долярaў. Галоўная прычына хваляваньняў заключаецца ў старых абвостраных адносінах паміж саюзамі, якія аб'ядноўць найбольш бедныя пласты працоўных, як рыкшы, і інш.

У камісіі НК РСІ СССР па рэарганізацыі прамысловасьці

Новы парадак кіраўніцтва прадпрыемствамі

У бліжэйшы час пачнецца рэарганізацыя прамысловасьці, пераменіцца парадак кіраўніцтва фабрыкамі і заводамі. Зараз прадпрыемствамі кіруе трэст, а трэстам—галоўнае кіраўніцтва ВСНГ СССР. Паводле новага парадку замест галоўнае ўправы будзе створана аб'яднаньне для кіраўніцтва аднароднымі заводамі.

Усе прадпрыемствы пераводзяцца на гаспадарчы разьлік. **Кожнаму заводу і фабрыцы надаецца свабода дзеяньняў.** Але за тое адміністрацыя прадпрыемстваў нясе поўную адказнасьць за выкананьне вытворчай праграмы і зьніжэньне сабекошту.

Прадпрыемствам будзе прадастаўлена права весьці перагаворы самастойна міма трэсту і аб'яднаньня, нават з вышэйшымі ўрадавымі органамі.

Атрымаўшы вытворчае заданьне, адпавядаючы ім, прадпрыемствы пачнуць распрацоўваць плян работы кожнага цэху. Цэх, у сваю чаргу, павінен даць заданьне кожнай брыгадзе рабочых упаасобку.

Асноўным паказальнікам работы прадпрыемства будзе зьніжэньне сабекошту. Калі заданьне па зьніжэньні сабекошту ня будзе выканана, аб'яднаньне мае права прызнаць работу заводу нездавальняючай.

Адна з задач рэарганізацыі кіраўніцтва—як мага больш поўна выкарыстаць практычны вопыт тэхнічнага і рабочага пэрсаналю. Пастаноўлена арганізаваць на прадпрыемствах тэхнічныя нарады, у склад якіх увойдуць прадстаўнікі тэхнэрсаналю, кваліфікаваныя рабочыя, заводзкія вынаходцы, майстры.

Камісія НК РСІ лічыць неабходным зьвярнуць асаблівую ўвагу на прыцягненьне да гэтай работы маладых інжынэраў.

Арышт забастовачнага камітэту за заклік да барацьбы з штрэйкбрэхэрамі

БЭРЛІН, 23. Арыштаваныя гэтымі днямі 8 прадстаўнікоў забастовачнага камітэту трубапракладчыкаў дапытаны сьледчым паліцэй-прэзыдыумы. Супроць 7-мі дадзены загад аб затрыманьні іх пад вартай на тэй падставе, што імі падпісана адозва «на бальшавіцкі лад» аб выгнаньні штрэйкбрэхэраў. Сход трубапракладчыкаў пастанавіў працягваць барацьбу в падвойнай энэргіяй. Пасьля сходу ўдзельнікі яго паладзілі вялікую дэманстрацыю. На многіх прадпрыемствах Бэрліну ўхвалены рэзалюцыі пратэсту забастовачнага камітэту. Рабочыя некаторых будаўнічых прадпрыемстваў правялі забастоўку пратэсту і салідарнасьці. (ТАСС).

Гільфэрдынг дагаварыўся з швэдзкім трэстам

СТАКГОЛЬМ, 21. Паміж нямецкім урадам і швэдзкім запалкавым сындыкатам заключана згода, паводле якое швэдзкаму запалкаваму сындыкату даецца манаполія на збыт, экспарт і імпарт запалак у Нямеччыне на пэрыяд—найменей 32 гады і найдаўжэй—50 год. Тэрмін манаполіі будзе залежаць ад часу аплаты пазыкі ў 125 млн. долярaў, якую запалкавы сындыкат дасьць нямецкаму ўраду.

Цана на запалкі павышаецца з 25 пфэнігаў за 10 пачкаў да 30 пфэнігаў. Згода гэта павінна быць ратыфікавана нямецкім рэйхстагам і ўвойдзе ў моц тады, калі рэйхстагам будзе ўхвалены плян Юнга. (ТАСС).

Самалёт „Краіна Саветаў" у Норд-Платэ

НЬЮ-ЁРК, 22. З Норд-Платэ ў штаце Нэбраска паведамляюць, што самалёт «Краіна Саветаў» прыбыў сюды а 17 гадз. паводле гадзіньніка цэнтральнага поясу. Пералёт самалёту з гораду Салёнага Возера ў штаце Утах у Норд-Платэ працягваўся каля 7 гадз., адлегласьць—1.026 клм.

Вялікія манэўры японскай арміі і флёту

ТОКІЁ, 22. 21-га кастрычніка каля беларогу Японіі пачаліся вялікія камбінаваныя манэўры японскай арміі і флёту. Манэўры разьлічаны на 10 дзён і ў іх прымае ўдзел 160 вымпелаў, 30 тысяч

Сац.-дэмакратычны міністар Гржэзінскі пашырае правы паліцыі

БЭРЛІН, 18. Прускі ўрад, па ініцыятыве прускага міністра ўнутраных спраў сацыял-дэмакрата Гржэзінскага, мяркуе яшчэ да правядзеньня агульнанямецкага закону аб ахове рэспублікі выдаць новую пастанову, згодна якой паліцыі надаецца права забараняць сходы (нават тыя, якія адбываюцца ў закрытых памяшканьнях), у выпадку, калі гэтыя сходы пагражаюць «спакою і парадку». Гэта пастанова таксама прадбачыць прысутнасьць на сходах паліцэйскіх у форме ў якасьці афіцыяльных прадстаўнікоў дзяржаўнай улады. Адначасова з гэтым паведамляецца, што чуткі аб надыходзячай забароне «сталёвага шлему» ва ўсёй Нямеччыне пазбаўлены ўсякіх падстаў. (ТАСС).

Перамога левага крыла прафсаюзу швэйнікаў

ВАРШАВА, 23. На апошнім паседжаньні Варшаўскага прафсаюзу швэйнікаў выбары скончыліся перамогай левага крыла. На мылавараным заводзе «Зіхт» выбары дэлегатаў таксама скончыліся перамогай левых.

Паход супроць камдэпутатаў у Прусіі

БЭРЛІН, 23. Прускі ляндтаг прыняў пастанову аб выдачы суду 23 дэпутатаў ляндтагу, галоўным чынам, камуністых.

НЯМЕЧЧЫНА ЎЗБРОЙВАЕЦЦА

Спушчан на воду новы крэйсэр „Лейпцыг"

БЭРЛІН, 18. На морскіх вэрфях у Вільгэльмсгафэне спушчаны на ваду новы крэйсэр «Лейпцыг». Згодна вэрсальскаму дагавору Нямеччына мае права на 8 лёгкіх крэйсэраў, з якіх несьці службу будуць толькі 6. Новы крэйсэр «Лейпцыг» зьяўляецца пятым па ліку лёгкім нямецкім крэйсэрам. Такім чынам, праграма Нямеччыны на пабудову крэйсэраў, якія могуць несьці службу, амаль выканана. У апошнія гады Нямеччынай былі пабудаваны таксама 12 мінаносцаў навейшага ўзору. (ТАСС).

Аўстрыйскія сац.-лёкаі прапануюць свае ўслугі фашызму

ВЕНА, 23. Учора ў аўстрыйскім парлямапце адбылося першае чытаньне законапраектаў аб рэформе канстытуцыі. Выступіўшы ад сацыял-дэмакратаў Рэнэр заявіў, што ўнесеныя ўрадам законапраекты сацыял-дэмакраты адхіляюць, бо гэтыя законапраекты фактычна аднаўляюць ранейшы закон супроць сацыялістых і падаюць прэзыдэнту дыктарскія правы.

Зварочваючыся да буржуазных партый, **Рэнэр прасіў не забываць «заслуг» сацыял-дэмакратыі па часьці барацьбы з камуністычным рухам. Рэнэр адзначыў, што падобна нямецкім сацыял-дэмакратам, аўстрыйскія таксама згодны ўвайсьці ў каліцыю з буржуазнымі партыямі.** У заключэньне Рэнэр заявіў, што сацыял-дэмакраты гатовы абгаворваць пытаньне аб рэформе канстытуцыі.

Рэнэру адказваў былы міністар асьветы Шмідт, прадстаўнік правага крыла хрысьціянска-сацыяльнай партыі з урадам Шобэра і праграмай хэймвэру, Шмідт даў вразумець, што дзяржаўны пераварот няўхільны, калі рэформа канстытуцыі ня будзе праведзена безадкладна. Буржуазны друк задаволены выступленьнем Рэнэра і характарызуе спрэчкі па рэформе канстытуцыі, як «пляхэтны паядынак».

***

ВЕНА, 23. Рэзалюцыя, якая прынята р

Гаджыкістанская ССР

Дзюшамбэ—маленькая сталіца, на жаль, мала вядомага вялізарнага краю, які бурна расьце.

Аб Савецкім Таджыкістане толькі цяпер, зусім нядаўна, пачалі зьяўляцца ў газэтах заметкі, артыкулы, паведамленьні. Многія аб гэтым надзвычай цікавым краі, межы якога тысячамі кілёмэтраў цягнуцца ўздоўж Кітая і Аўганістана, ня маюць яснага ўяўленьня. Нямногія ведаюць, напрыклад, што ўвесь Савецкі Памір уваходзіць аўтаномнаю вобласьцю ў Таджыкскую рэспубліку і зьяўляецца адною з яе 7 округ. Мала каму вядома, што іменна ў Таджыкістане тэрыторыя Савецкага Саюзу налыходзіць асабліва блізка да мяжы пэрлавых уладаньняў ангельскага караля—Брытанскае Індыі.

***

У СССР 6 саюзных рэспублік, значыць Таджыкістан (зараз аўтаномная ССР) будзе 7-аю, а толькі-ж у 1925-26 годзе таджыкскі дэхкан пры дапамозе Чырвонае армії выбіў апошнія рэшткі банд Энэвэр-пашы, Ібрагім-бэка, Фузайлі Максума і распачаў аднаўленьне на новых падставах свае разбуранае басмачамі гаспадаркі. А зараз?

У 1913 годзе ў Таджыкістане было 317 тыс. гэкт. палїўное зямлі, у 1924-25 годзе —66 тыс. гэкт., у 1926-27—121 тыс., у 1927-28—160 тыс. гэкт., а ў 1928-29—200 тыс. гэкт. На наступны год мяркуецца давесьці да 240 тыс. гэкт.

У той-жа час бавоўна з 2.000 гэкт. у 1926 годзе вырасла да 18.000 у 1927 годзе, да 39.000—у 1928 годзе і да 60 тыс. з лішнім гэктараў у 1929 годзе, а ў канцы пяцігодкі, г. значыць праз тры гады, Таджыкістан мецьме 200 тыс. гэкт. бавоўняных пасеваў. Гэта ўжо ня проста рост, гэта бурны, нябачане ў сьвеце тэмп росту, пры чым **росты на новай падставе**, бо калі ў даваенны час дэхкане сеялі мала ўраджайную, нізкарослую мясцовую бавоўну—«гузу», дык цяпер на палёх цьвіце амэрыканскі «арыстакрат»—«Наўроцкі» і нават «эгіпцяне» з доўгім падобным да шоўку валакном. Скупляе гэтую бавоўну не спэкулянт-купец, або прыкаўчык якога-небудзь капіталістага, а Савецкая дзяржава, якая авансуе дэхкан грашыма, хлебам, угнаеньнем і машынамі пад яго ўраджай.

Дзяржава-ж будуе дарогі, таварныя базы, купляе хлеб, які раней ляжаў з прычыны адсутнасьці рынку, шырока разьвівае тэхнічныя культуры, імкнецца ўсямерна палегчыць дэхканскую працу. Ужо зараз пабудавана 225 клм. чыгуначнай лініі Тэрмэз-Дзюшамбэ, 500 клм. аўтамабільных і калёсных дарог, 12 больніц і 60 амбуляторый, праз якія прайшлі на працягу году 160 тыс. хворых (а у ТАССР усяго мільён насельніцтва).

У краі вучыцца 20 тыс. школьнікаў, а гэта толькі пачатак.

У радзе округ і раёнаў Таджыкістану (Гарм, Матча, Ховалінг, Фальгара, Памір), дэхкане да гэтае пары ніколі ня бачылі калаша ў Гарме і Кулябе раней зьявіўся самалёт і дэхкане ўжо ня дзівяцца шэрай металёвай птушцы, якая шпарка праносіцца над іх пасевамі, але з зацікаўленасьцю мацаюць калёсы заведзенае «Сельхозснабам» арбы і захапляюцца ёю.

Забабоны, надзвычайны ўплыў баёў, муллы, «былых людзей», бадай агульная няпісьменнасьць насельніцтва, розпастайнасьць эканомікі, быту і клімату, раскіданасьць тэрыторыі краю—усё гэта нязвычайна ўтрудняла і ўтрудняе зараз працу па перабудове Таджыкістану ва ўзоравую для працоўных суседніх краёў сацыялістычную савецкую рэспубліку.

Улетку гарачыня ў Дзюшамбэ дасягае да 70-80 градусаў а ў мясцовасьці Харгуш каля возера Зор-Куль на Памірскім плоскаўзвышшы часамі бушуе страшэнная мяцеліца.

У Сарай-Камары, горадзе на беразе ракі Пяндж, каля самае аўганскае мяжы, сьпее далікатнае валакно эгіпэцкае бавоўны, а ў Вахане (Памір) ледз-ледзь высьпявае шаўкавіца, лісьцямі якое ў нас кормяць шаўкоўныя чэрві.

У Кангурце і Гісары ўжо ў лінеі дэхкане малацілі хлеб. А за сотні вёрст у Гарме, Ванчы, Матчэ і Фальгары яго зьбіраюць толькі ў верасьні. Край гэты таксама надта багаты і выкапнямі, у капальнях «Кугелцю»—багатыя жылы яркіх, як кроў, рубінаў, у Ванчы і Дарвазе—жалеза і сьвінец, у Гармэ Хавалінае, Матчы—золата, у Пэнджыкэнце —вугаль, у Гісары—нафта.

На неабсяжнай пашы Хаіта, Джыргаталя, Гісара і Паміра—сотні тысяч галоў жывёлы, і сярод іх гонар Таджыкістана —вядомая нават у Амэрыцы гісарская аўца, якая важыць 12 пуд., і моцны лакайскі конь.

У багатых вадою далінах—сотні тысяч гэктараў каштоўнай зямлі, здатнай пад амэрыканскую і эгіпэцкую бавоўну. А на сопках, якія акружаюць гэтыя далины—мільёны гэктараў багары, якая можа даць сотні тысяч вагонаў першагатункоае шпаніны для вываву ў овоўнаводчыя раёны як самога Таджыкістана, так і Сярэдняй Азіі.

Рэдка ў якой-небудзь іншай рэспубліцы можна сустрэць такія неабсяжныя, вялізныя магчымасьці для разьвіцьця вытворчых сіл, для разьвіцьця бавоўнаводства, для плянаў і работы па стварэньні ўзоравай савецкай сацыялістычнай рэспублікі.

***

Усё, што зроблена партыяй і савецкай уладай у Таджыкістане, ужо зрабіла цэлую рэвалюцыю ў эканоміцы і быце яго кішлаку.

Ленін гаварыў: «Пры дапамозе пралетарыяту найбольш перадавых краін, адсталыя краіны могуць перайсьці да савецкага ладу і праз пэўныя ступені разьвіцьця—да камунізму, мінуючы капіталістычную стадыю разьвіцьця».

У Таджыкістане мы маем яскравую ілюстрацыю правільнасьці праведзенай у жыцьцё ленінскай установкі.

Усе посьпехі (аднаўленьне палїўное плошчы, рэканструкцыя сельскае гаспадаркі, прасяканьне арбы, разьвіцьцё бавоўнаводзтва, рацыівіцьцё дарог, прасяканьне эўрапэйскага сельска-гаспадарчага інвэнтару, рост таварнасьці, рост школ і больніц) былі дасягнуты, галоўным чынам, дзякуючы вялізарным укладаньням у сельскую гаспадарку Таджыкістана з боку саюзнага пралетарыяту.

За апошнія чатыры гады ў народную гаспадарку Таджыкістана Саюз уклаў каля 80-90 мільёнаў руб. (ня ўлічваецца бюджэт наступнага году).

У 1926 годзе бюджэт ТАССР складаў 3 з палов. млн. руб. а ў 1929 годзе будзе даведзены да 40 мільёнаў. Ні пры якай іншай сыстэме, акрамя сыстэмы дыктатуры пралетарыяту, якая імкнецца на справе ліквідаваць фактычную няроўнасьць паміж паасобнымі рэспублікамі СССР, што былі да рэвалюцыі царскімі калёніямі, ня былі-б зроблены такія грандыёзныя ўкладаньні, якія зроблены з боку Саюзу ў Таджыкістане за апошнія чатыры гады.

Л. Г.

НАВІНЫ САВЕЦКАГА ДНЯ

Праект новага генэральнага пляну электрыфікацыі краю

На чарговым пасяджэньні Эканомнарады РСФСР пад старшынством тав. Ляжавы быў разгледжаны агульнасаюзны законапраект, які прадугледжвае рад мерапрыемстваў па забесьпячэньні кіруючай ролі энэргетыкі ў народнай гаспадарцы краю.

У зьвязку з тым, што плян электрыфікацыі ГОЭРРО амаль заканчваецца, а рост індустрыялізацыі краю і сельская гаспадарка, якая рэканструюецца, прад'яўляюць усё новыя і новыя патрабаваньні да энэргетычнай базы, Эканомнарада прызнала патрэбным зараз-жа прыступіць да распрацоўкі новага генэральнага пляну электрыфікацыі.

Асноўная ўстаноўка новага генэральнага пляну выходзіць з неабходнасьці поўнасьцю задаволіць энэргіяй патрэбнасьці інтэнсыўна узрастаючай прамысловасьці, індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі, узрастаючага спажываньня гарадоў, камунальнае гаспадаркі і транспарту. Ва ўсіх раёнах Саюзу мяркуецца стварыць сыстэму адзінае энэргетычнае гаспадаркі з магутнай сеткі высокавольтавых электраперадач, якая злучала-б спажыўцоў раёнаў з цэнтралізаванымі крыніцамі электраэнэргіі. Пры гэтым намячаецца максымальнае скарыстаньне мясцовых энэргетычных запасаў і, у прыватнасьці, тых запасаў, якія мае прамысловасьць у выглядзе адкідаў вытворчасьці, тэхналёгічнага цяпла і г. д.

Эканомнарада прызнала неабходным максымальна скараціць тэрмін пабудовы буйных энэргетычных установак і ў прыватнасьці цеплавых станцый.

Пабудова буйнейшага гіганта савецкае індустрыі

МАСКВА, 22. Галоўны інжынэр будаўніцтва Днепрапятроўскага прамысловага камбінату т. Ротэрт, які знаходзіцца ў Маскве, заявіў, што ў сучасны момант ужо закончаны некаторыя папярэднія работы па пабудове новага буйнейшага гіганту савецкай індустрыі. На левым беразе Дняпра закончана з'ёмка пляцу, дзе будзе разьмешчаны камбінат. Ужо будуецца завод будаўнічых матар'ялаў. Пачата пабудова 20 трохпавярховых дамоў для забесьпячэньня жыльлём кваліфікаваных рабочых і служачых будаўніцтва. Гэтыя дамы складуць першае ядро будучага новага гораду «Вялікае Запарожжа». Для 2000 часовых рабочых канчаецца пабудова 30 агульных памяшканьняў. На працягу зімы будзе пабудавана яшчэ 60 такіх агульных памяшканьняў для 600 рабочых. Са сьнежня будзе пушчаны лесапільны завод і пачнецца дастаўка камяню з кар'ераў Днепрастрою па тэрыторыі новага будаўніцтва. Усе падрыхтоўчыя работы будуць закончаны ў 1930 годзе. Асноўныя работы па пабудове камбінату, у які ўвойдуць некалькі новых заводаў, будуць разгорнуты з другога будаўнічага сэзону. Агульны кошт усіх будаўнічых работ па пабудове камбінату—400 мільёнаў рублёў. Кошт абсталяваньня—200 мільёнаў руб. Магчима, што для кіраўніцтва ўсім гэтым вялізарным будаўніцтвам будзе створана асобнае кіраўніцтва пры ВСНГ СССР.

БАГАЦЬЦІ ЎРАЛУ

МАСКВА, 21. Інстытутам прыкладное мінэралёгіі выкрыты на Паўднёвым Урале у «отвалах» старой залатой руды, недалёка рэк Самаркі і Кменкі мінэрал манацыт, які мае рэдкія элемэнты (торый, цэрый і інш.). Здабываньне і транспарт манацыту могуць быць лёгка арганізаваны. Уральскі манацыт неабходны савецкай прамысловасьці для вырабаў масы, якая сьвеціцца, дзе ён заменіць ужываемы да гэтага часу радый і імпартны паўдзённа-амэрыканскі манацыт.

ПАКЛАДЫ ФАСФАРЫТУ НА РАЦЭ ВЯТЦЫ

ВЯТКА, 19. У Вятку прыбыла экспэдыцыя геалёгічнага камітэту, якая скончыла абсьледваньне заляганьняў фасфарыту ў Амутнінскім раёне. Экспэдыцыя выявіла паклады фасфарыту на правым беразе Вяткі. Гэтыя паклады маюць вялікае прамысловае значэньне. Некалькі мільёнаў тон фасфарыту залягаюць у адным месцы на плошчы ў 4 квадратныя кілёмэтры.

7 дзейных вулканаў на Камчатцы

ХАБАРАЎСК. 20. На Камчатцы пачаўся выбух бязьдзейнага 60 год вулькану Гарэлы, які знаходзіцца ў 60 кілёмэтрах ад Петрапаўлаўска. Вулькан выкідае газы на вышыню 3-х кілёмэтраў. Паводле ўсіх дадзеных з вулькану выліваецца лава. На вяршыні Ключэўскай сопкі паявілася полымя. Цякуць патокі лявы. Пачаўся выбух сопкі Жупанаўскай. Зараз на Камчатцы дзейных 7 вулканаў.

ЗЬВЯЗДА

ЧЫСТКА САВЕЦКІХ ЯЧЭЕК КП(б)Б

Чыстка выкрывае правых апартуністых, скрытых трацкістых і людзей, няздольных быць актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычн. наступленьня

Праверка паказвае нерашучасьць некаторых ячэек у барацьбе са скажэньнямі клясавай лініі, адсутнасьць бальшавіцкай чуласьці і патрэбнага рэагаваньня на антыпартыйную дзейнасьць асобных працаўнікоў

Ячэйкі, выкінуўшы з сваіх радоў нягодных камуністых, павінны ў шмат разоў узьняць сваю баяздольнасьць у ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі

Больш выразна ажыцьцяўляць дырэктывы партыі
Што паказала чыстка ячэйкі працасьветы

Гэтымі днямі скончылася праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б **саюзу працасьветы.** Зьвыш 2-х тыдняў праверком вывучаў работу ячэйкі і яе паасобных членаў. У выніку праверкі і чысткі праверком выключыў з радоў партыі 8 асоб і даў розныя партспагнаньні 21 таварышу.

Праверком высьветліў шмат адмоўных бакоў у работе ячэйкі, галоўным з якіх зьяўляецца тое, што ячэйка **не рэагавала на праявы нацыянал-дэмакратызму і шавінізму** і нават не паставіла пытаньня аб барацьбе з гэтымі зьявішчамі на абгаварэньне ячэйкі. Між тым, у ячэйцы мелі месца праявы шавінізму. Напрыклад, кандыдат партыі Шапсялевіч заявіў: «жывем на Беларусі, ясі беларускі хлеб, дык павінен ведаць беларускую мову»; член ячэйкі Мацюкевіч, відомы па сваіх мінулых нацыянал-дэмакратычных хістаньнях, з прычыны зьяўленьня Баліцкага в пасады Наркамасьветы сказаў: «самага разумнага наркома зьнялі» і г. д.

Вялікія недахопы праверком знайшоў у палітвыхаваўчай работе ячэйкі. Некаторыя кандыдаты партыі — асобы з вышэйшай асьветай — давалі адказы на запытаньне: «чаму наша партыя называецца камуністычнай»? — «Ня ведаю»—і «у чым сутнасьць правага ўхілу? — «не скажу» і г. д. Клясычныя па сваёй няісьменнасьці адказы, якія сьведчылі аб тым, што людзі, атрымаўшы вышэйшую адукацыю, зусім ня цікавіліся партжыцьцём.

Канкрэтныя праявы правага ўхілу не спаткалі належнага рэагаваньня з боку ячэйкі.

А яны былі — вось факты: на агульна-адукацыйных курсах абкладваюцца аднолькава платай за навучаньне: і рабочы, які атрымлівае пэнсіі 80 руб., і селянін, які плаціць падатку звыш 80 руб. У пагоні за бездэфіцытнасьцю курсаў адмаўляюць у прыёме рабочым, тры сялянкі-бядняцкі даюць такую падпіску: «я, як **непадыходзячы элемэнт, вучуся на курсах, абавязваюся плаціць 5 руб. за вучэньне**».

У ячэйцы былі тры трацкістыя, з якіх 2, будучы актыўнымі ў трацкісцкай апазыцыі, былі, пасьля аднаўленьня іх у партыі, зусім пасыўнымі. Ячэйка ня выявіла, наколькі шчыра яны адыйшлі ад трацкізму. А прычын для сумненьняў у шчырасьці магло быць шмат. Былая апазыцыянэрка Барысэвіч заявіла пры чыстцы, што ў той час, калі яна падавала заяву аб адыходзе ад апазыцыі, у яе яшчэ былі разгалосьсі з партыяй і толькі зараз яна цалкам згодна з лініяй партыі.

Ячэйка мала ведала сваіх членаў, бо як інакш магло здарыцца, што член партыі Ксяжжук, які меў цёмнае палітычнае мінулае, быў у мінулым складзе бюро ячэйкі, нават апоргам.

Высьветліўшы пры дапамозе разгорнутай у часе праверкі самакрытыкі недахопы ў рабоце ячэйкі, праверком вынес шмат пастаноў, якія павінны выправіць работу ячэйкі, накіраваць яе на больш рашучае выкананьне партдырэктыў.

Трэба адзначыць жывы, актыўны ўдзел беспартыйных у рабоце праверкому і зусім слабы ўдзел камсамолу. На апошняе камісія зьвярнула ўвагу, але на гэта таксама парэнен зьвярнуць увагу і РК ЛКСМВ.

ЯКАЎЛЕЎ.

Скажэньні ў практыцы Наркампрацы
(НА ЧЫСТЦЫ ЯЧЭЙКІ НАРКАМПРАЦЫ)

Ячэйка КП(б)В Наркампрацы слаба надрыхтавалася да чысткі. На праверачных сходах адсутнічаюць партыйцы і рабочыя з прымацаванай цагельні.

Ячэйка Наркампрацы кіруе такімі арганізацыямі, як біржа працы, кіраўніцтва працкалектывамі, інспэкцыя працы, арганізацыямі, якія заўсёды зьвязаны з масамі, абслугоўваюць масы, і ўсіх іх у праверцы быў-бы вельмі карысным і, больш таго, неабходным.

Ужо са спрэчак па дакладу бюро ячэйкі відаць было, што ня ўсё ў ячэйцы добра. Калі паўстала пытаньне аб скажэньнях клясавай лініі ў практыцы работы Галоўсацстраху, у прыватнасьці ў справе вызначэньня пэнсій, дык старшы інспэктар т. **Давідовіч** адказаў, што гэта зусім зразумела, бо само заканадаўства па сацстраху да 1929 г. не насіла клясавага характару. Выходзіць, па думцы работнікаў Галоўсацстраху, што на працягу 12 год палітыка сацстраху ў прызначэньні пэнсій была няклясавай. Якое вынаходзтва! Як быццам хто вінаваты быў што, прызначаючы пэнсію буйным домаўласьнікам, гандляром і інш., органы сацстраху рабілі гэта ў габінэтах, ня робячы нават абсьледваньня. Галоўсацстрах у зьяўляцці з пэнсіі «былых» людзей правіў поўную несамастойнасьць. Калі страхкаса каго і зьнімала з пэнсіі, дык Галоўсацстрах заўсёды адмяняў не пастанову і запрошваў Маскву.

Ячэйка не ўдзяляла належнай увагі рабоце біржы працы. Паміж загадчыкам біржы і інспэкцыяй былі заўсёды спрэчкі, недавер'е, што рабіла дрэнны ўплыў на ўсю работу. На біржы да гэтага часу захаваўся парадак пасылкі на працу рознымі запіскамі, якія пішуцца ўсімі, каму толькі жажадаецца.

Сацыялістычнае спаборніцтва не закрануло ўсёй масы супрацоўнікаў. Камісія па агляду працы інспэкцыі прыступіла да працы і праверкі палітыкі штрафаў толькі за 2 дні да чысткі. Між тым, у галіне штрафной палітыкі яўна **скрыўлялася клясавая лінія: бяз усякага абсьледваньня з кулакоў і нэпманаў зьнімаліся штрафы; за адно і тое-ж парушэньне аднолькавы штраф плаціў і ксёндз, і селянін, і рабочы.**

Апарат у Наркампрацы не арабочаны. Тыя вылучэнцы, якія працуюць у інспэкцыі і на біржы, не атрымліваюць належнай дапамогі. Вылучэнцу, заг. сэкцыяй чорнарабочых, ніхто не расказаў, як трэба працаваць, каго трэба слухацца і г. д. Вылучэнец, зьвярнуўшыся да сакратара ячэйкі за дапамогай, атрымаў адказ: «Я табе ня нянька». На самой біржы не вядзецца ніякай палітыка-выхаваўчай работы сярод беспрацоўных.

Праверком усебакова падыходзіў да правяраемых.

Зараз галоўная задача—шырока прыцягнуць працоўныя масы да большага ўдзелу ў чысткі. Патрэбна, каб ячэйка прымацаванай цагельні прыняла-б салраўдны ўдзел у чысткі і праверцы камуністых Наркампрацы.

НІКАНОРАЎ.

Партколектывы „Домбаля" і „Чырвонай Бярэзіны"—узмацнеце вярбоўку ў партыю перадавых пралетараў

У ліпені ЦК КП(б)Б на дакладу Барысаўскага райкому партыі аб росьце раённай арганізацыі за лік рабочых і работніц, ухваліў наступную пастанову: —ЛІЧЫЦЬ ТЭМП РОСТУ АРГАНІЗАЦЫІ ЗУСІМ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫМ.

Сакратарыят ЦК паказаў раённаму камітэту на патрэбнасьць узмацненьня тэмпу вярбоўкі ў партыю перадавых пралетарскіх кадраў.

Зараз ужо можна падагуліць вынікі рэалізацыі дырэктывы ЦК.

У трэцім квартале ў партыю прынята 189 чалавек. Рабочае ядро сярод прынятых у КП(б)Б складае 93,9 проц. Рэшта прыпадае на калгасьнікаў, сялян бедняко́ў і г. д. Гэтыя лічбы зьяўляюцца яскравымі паказальнікамі работы арганізацыі па вярбоўцы рабочых і работніц. Рост арганізацыі ў трэцім квартале ішоў за лік старых кваліфікаваных рабочых ад варштату і батракоў.

Агульная колькасьць рабочых у арганізацыі павялічылася з 77 проц. да 80 проц. Колькасьць служачых зьменшылася на адзін процант.

Паступова расьце партыйная праслойка не буйнейшых прадпрыемствах Барысаўшчыны. На заводзе «ДОМБАЛЬ» парт'ядро вырасла з 11 проц. да 12,5. На «ЧЫРВОНАЙ БЯРЭЗІНЕ» партыйная праслойка павялічылася на 4 проц., на заводзе «Камінтэрн» на 3 і г. д.

У першых радох па вярбоўцы ідуць дробныя вытворчыя калектывы. Так, на чыгунцы партпраслойка складае 33 проц., на фабрыцы «Прафінтэрн»—40 процантаў, на заводзе імя «Розы Люксэмбург»—42 і г. д.

Гэтыя лічбы тлумачацца тым, што на дробных прадпрыемствах, якія аб'яднаюць невялічкія кадры рабочых, лепш пастаўлена культурна-выхаваўчая работа.

Раённы камітэт партыі павінен прыняць усе меры па рашучым паляпшэньні партыйна-выхаваўчай работы на такіх вялікіх прадпрыемствах, як «Домбаль», «Чырвоная Бярэзіна» і іншыя, на якіх працуе некалькі тысяч рабочых.

На «Чырвонай Бярэзіне», дзе працуюць сотні рабочых і работніц, ёсьць навычэрпныя рэзэрвы для росту партыйнага калектыву. Між тым, партыйная праслойка на прадпрыемстве зусім невыстарчальная (16 процантаў).

На заводзе «ДОМБАЛЬ» таксама ёсьць шмат перадавых рабочых-актывістых, якія могуць і павінны быць у партыі, але ўсё-ж рост калектыву ідзе слаба. Партыйная праслойка на прадпрыемстве зусім нязначная і ледзь дасягае 12 проц. Падагульваючы гэтыя лічбы і факты, можна зрабіць некаторыя вывады.

БАРЫСАЎСКАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ПРАВЯЛА ВЯЛІКІЮ РАБОТУ ПА ВЯРБОЎЦЫ Ў ПАРТЫЮ НОВЫХ КАДРАЎ РАБОЧЫХ, РАБОЦНІЦ І БАТРАКОЎ.

АЛЕ НА ГЭТЫМ ВУЧАСТКУ ЁСЬЦЬ ЯШЧЭ ЗНАЧНЫЯ НЕДАХОПЫ І АДНЫМ З ІХ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ТОЕ, ШТО БУЙНЕЙШЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ ПАРТКАЛЕКТЫВЫ БАРЫСАЎШЧЫНЫ СЛАБА ЎЦЯГВАЮЦЬ У СВАЕ РАДЫ ПЕРАДАВЫХ ПРАЛЕТАРАЎ.

В—у.

Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары ў будынку ЦК КП(б)Б у залі пасяджэньняў (2-гі паверх) склікаецца нарада выкладчыкаў на курсах вылучэнцаў пры ЦК.

На нараду запрашаюцца т. т. Лур'е, Саевіч, Рыўлін, Гольдштэйн (Дзяржплян), Ракаў (ЦКК), Стракоўскі (ВСНГБ), Канаплін, Гурыновіч, Лойка, Сагалевіч, Пятосін, Чаржынскі, Бабчонак, Дымельфар, Шчапоцьцеў, Мінкевіч Ф., Міцкевіч А., Бабарэка, Шалавураў, Гольфанд, Паотуховіч, Зубковіч, Тамашэўскі, Гурэвіч, Аксэльрод, Окур, Сакерская Буткевіч, Шчпавалаў, Росін, Скарабагаты, Бондар, Маргелаў, Тамашоў, Казлоўскі, Чабан, Раготнер, Айзенштад, Пікус і Гурвіч (Рабфак).

Прарывы ў ячэйцы Лесбелу

ТРАЦКІСТЫЯ НА ЧАЛЕ ПАРТ'ЯЧЭЙКІ. — БЕСПРЫНЦЫПОВАЕ ДЗЯЛЯЦТВА ЗАМЕСТ ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ.—ПРЫМІРЭНЦТВА ДА ЎХІЛАЎ АД ЛІНІІ ПАРТЫІ

ЯЧЭЙКА НЯ ВЫКАНАЛА ДЫРЭКТЫУ ПАРТЫІ

Партыйная ячэйка Лесбелу (Менск) дапусьціла ў сваёй рабоце грубыя палітычныя памылкі і скажэньні лініі партыі. У ячэйцы мелі месца факты важымy самакрытыкі, прымірэнцтва да ўхілаў ад лініі партыі і беспрынцыповага дзяляцтва.

На чале ячэйкі стаяў удзельнік трацкісцкай апазыцыі, кар'ерысты і падхалім, які наўмысьля тармазіў і зрываў партыйную работу.

Сярод членаў ячэйкі былі тэарэтыкі і практыкі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, якія ў свой час арганізавалі ў ячэйцы сваю трацкісцкую групу.

«ПРЫНЯЦЬ ДА ВЕДАМА»

Ячэйка складаецца з 11 членаў і кандыдатаў партыі, якія ў большасьці зьяўляюцца адказнымі савецкімі працаўнікамі Сярод членаў ячэйкі ёсьць старыя, вытрыманыя камуністыя, якія маюць вялікі партыйны стаж. Здаецца, што пры такім складзе ячэйка павінна была стаць моцным і згуртаваным калектывам, здольным выразна праводзіць лінію партыі. Але ў сапраўднасьці ячэйка ня справілася з пастаўленымі перад ёю палітычнымі задачамі і дапусьціла ў сваёй практыцы прарывы і скажэньні партыйнай лініі.

Партыйна-палітычную работу ячэйка замяніла беспрынцыповым дзяляцтвам, дробнымі, асабістымі справамі. Ячэйка абярнулася ў арэну для ўзаемнай барацьбы паміж асобнымі камуністымі, у месца, дзе члены партыі імкнуліся скампрамэтаваць і дыскрэдытаваць адзін другога.

Ячэйка ня цікавілася і не кіравала палітычна-гаспадарчым жыцьцём і работай установы. Што робіцца ў камсамольскай ячэйцы, парт'ячэйка ня ведае.

Поўную бязьдзейнасьць ячэйкі скарысталі варожыя элемэнты, якія пралезьлі ў апарат Лесбелу. Яны ў апошнюю перавыбарчую кампанію высунулі лёзунг: **«Мясцком без камуністых».**

Сярод беспартыйных супрацоўнікаў гэтыя элемэнты разгарнулі ўзмоцненую актыўную агітацыю супроць ячэйкі, каб правесьці ў склад мясцкому сваіх кандыдатаў.

Ячэйка **не рэагавала** на гэту агітацыю. Недахваты і антыпартыйныя ўчынкі асобных таварышоў бюро **замазвала** і ня выносіла на шырокае абгаварэньне. У ячэйцы крытыка і самакрытыка зусім не разгорнуты. Дзяляцтва і склочніцтва разьядалі ячэйку, асобныя члены партыі падхалімічалі і скарыстоўвалі свае партбілеты ў асабістых, кар'ерысцкіх інтарэсах. А бюро нічога не зрабіла, каб разгарнуць самакрытыку і вынішчыць усе гэтыя недахваты. Дзяляцтва ў рабоце дайшло да таго, што ячэйка пасьля абгаварэньня пастаноў XVI партыйнай канфэрэнцыі ўхваліла наступную пастанову: «Прыняць да ведама».

Такі чыноўніцкі дзяляцкі падыход да важнейшых пастаноў партыі лепш за ўсё сьведчыць аб унутрыпартыйным становішчы ячэйкі.

ТРАЦКІСТЫЯ НА ЧАЛЕ ЯЧЭЙКІ

Чым, аднак, вытлумачыць тое, што партыйна-палітычная работа ў ячэйцы заняпала і ячэйка апынулася ў балоце дзяляцтва. Чаму ячэйка бязьдзейнічала і не змагалася з антыпартыйнымі ўчынкамі асобных камуністых і скажэньнямі лініі партыі ў практычнай рабоце.

На ўсе гэтыя пытаньні дала адказ праверачная камісія, якая нядаўна скончыла праверку і чыстку ячэйкі. У часе чысткі высьветлілася, што сакратар парт'ячэйкі **Гарачун** зьяўляецца трацкістым і наогул чужым элемэнтам, які выпадкова трапіў у партыю.

У ячэйцы Лесбелу ў свой час існавала група трацкістых на чале з **Воўкавым і Ушкевічам**, якая праводзіла антыпартыйную, апазыцыйную работу. Тады-ж, бадай, уся ячэйка ўстрымалася ад галасаваньня за выключэньне Троцкага з радоў УсеКП(б). Зусім яшчэ нядаўна пры абгаварэньні пяцігадовага пляну большасьць членаў ячэйкі галасавала супроць пяцігодкі. Гэта было адкрытае выступленьне супроць лініі партыі. Бюро ячэйкі не рэагавала на выступленьні тых членаў ячэйкі, якія пад уплывам трацкісцкай ідэалёгіі выступілі супроць ухваленага ўсёй партыяй пяцігадовага пляну.

Сакратар ячэйкі Гарачун падтрымліваў цесную сувязь з трацкісцкай апазыцыяй, атрымліваў ад трацкістых падпольную контр-рэвалюцыйную літаратуру і антысавецкія лістоўкі. Пры выключэньні Троцкага з партыі Гарачун устрымаўся ад галасаваньня. У далейшым гэты трацкісты ўдала праводзіў сваю шкодную работу. Сваю сувязь з трацкістымі Гарачун старанна ўтойваў ад партыі. Ён сьядома і надмерна зрываў работу ячэйкі.

Гарачун скарыстоўваў свой партбілет і становішча сакратара ячэйкі для асабістых мэт. Ён выконваў грамадзкую работу, быў членам гарсавету, працаваў у эканомкамісіі, але ўсё гэта Гарачун рабіў для таго, каб умацаваць сваю кар'еру. Перад больш адказнымі працаўнікамі Гарачун падхалімнічаў.

АКТЫВІСТЫЯ МАЎЧАЛІ

Лепшыя члены ячэйкі, старыя камуністыя пратэставалі супроць такога кіраўніцтва і імкнуліся зьнішчыць тыя недахопы і скажэньні, якія мелі месца ў ячэйцы Лесбелу. Сакратар ячэйкі павёў сыстэматычную кампанію супроць старых членаў партыі, якія праводзілі правільную лінію і змагаліся з недахопамі і хваравітымі зьявішчамі ў ячэйцы. Так, напрыклад, сакратар ячэйкі заўсёды выступаў супроць тав. **Школьніцава**, які заўсёды праводзіў правільную лінію, і імкнуўся дыскрэдытаваць яго перад членамі ячэйкі. Але трэба адзначыць, што актывістыя ячэйкі не давялі сваю барацьбу да канца. У выніку гэтага Гарачун атрымаў магчымасьць бяскарна праводзіць сваю шкодную лінію.

А некаторыя актывістыя нават імкнуліся змазаць недахопы ў ячэйцы, кіруючыся вядомым прынцыпам: «сьмецьця з хаты ня выносіць».

Так, напрыклад, апорг ячэйкі не змагаўся з трацкісцкай ідэалёгіяй і нават у часе чысткі не дапамагаў камісіі па чыстцы выкрыць тых, хто за шыльдай партбілету захоўваў трацкісцкія погляды.

ВЫПРАВІЦЬ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАМЫЛКІ

Камісія выключыла з партыі **Гарачуна** за кар'ерызм і падхалімства, утойваньне ад партыі сваёй сувязі з трацкісцкай апазыцыяй і сьвядомае тармажэньне работы ячэйкі. Рад таварышоў за нерэагаваньне на хваравітыя зьявішчы ў ячэйцы і нерашучую барацьбу з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму атрымалі суровыя партыйныя спагнаньні.

Віна гэтых таварышоў тым больш зьяўляецца, вялікай таму, што яны не сыгналізавалі перад партыйнымі органамі аб прарывах у ячэйцы Лесбелу.

Камісія па чыстцы канстатавала, што:

— **Ячэйка за ўвесь час свайго існаваньня ня справілася з пастаўленымі перад ёю задачамі і ня выканала асноўных дырэктыў партыі. Камісія прапанавала ячэйцы распусьціць бюро і правесьці датэрміновы выбары новага бюро ячэйкі.**

Юр. ТАКАРЧУК.

Чыстка выкрыла шкурнікаў і кар'ерыстых

Скончана чыстка ячэйкі КП(б)Б хэмікаў. Чыстка прайшла пры актыўным удзеле беспартыйных рабочых і работніц з прымацаваных прадпрыемстваў Шклотрэсту. На праверачных сходах была шырока разгорнута самакрытыка, што сьведчыць аб добрай падрыхтоўцы ячэйкі да чысткі партыі.

Камісія пры дапамозе членаў ячэйкі і беспартыйных рабочых праверыла ўсю гаспадарча-палітычную і партыйную работу ячэйкі.

Чыстка паказала, што ячэйка зьяўляецца здаровай і ідэалёгічна вытрыманай. Але асобныя члены ячэйкі праявілі хістаньні і нерашучасьць пры выключэньні Троцкага з партыі. Некаторыя партыйцы ўстрымаліся ад галасаваньня за выключэньне Троцкага. Ячэйка своячасова рэагавала на гэтыя факты і растлумачыла таварышом памылковасьць іх учынку.

Потым гэтыя камуністыя прызналі свае памылкі і рашуча асудзілі контррэвалюцыйную дзейнасьць Троцкага.

Праверку прайшло 18 членаў і кандыдатаў партыі. Тры партыйцы выключаны з партыі.

Выключаны з партыі адказны працаўнік Шклатрэсту **Фіяла.** Ён займаючы адказную пасаду, працаваў, ня як камуністы, а як бюракрат і чыноўнік. Даручаную работу Фіяла выконваў механічна, адарваўся ад мас і г. д. Тав. Фіяла звязаўся з варожым элемэнтам і прысвоіў сабе ілжывыя рэвалюцыйныя заслугі.

Выключаны з партыі таксама і «камуністы» **Румянаў,** уноўнаваланы ленінградзкага «Жиртреста». Румянаў займаўся злачынствамі, шкурніцтвам і г. д. Асноўнай мэтай гэтага «партыйца» было паляпшэньне асабістага матар'яльнага становішча. Для дасягненьня гэтае мэты, Румянаў алоўжываў сваім службовым становішчам.

Чыстка выкрыла гэтага кар'ерыстага і падхаліма. Між іншым, Румянаў утаіў ад партыі сваё сапраўднае сацыяльнае паходжаньне. Тры члены партыі атрымалі партыйныя спагнаньні за парушэньне парт'этыкі і невыкананьне дырэктыў ячэйкі.

РАБКОР.

У калгасы па праўду

ВЯЛІКІЯ ПЭРСПЭКТЫВЫ ВЁСАК МІКАЛАЕВІЧЫ, ЗАБАЛАЦЬЦЕ І ЗАГОР'Е

На высокім узгорку, за паўтара кілёмэтра ад чыгункі і пры вялікім шляху Масква-Менск красуюцца цесна ступеньня і цесна зьвязаныя эканамічна тры вёскі — Мікалаевічы, Забалацьце і Загор'е.

Вялікі дзікі балотны масыў гэтых вёсак шчыльна падыходзіць да самай станцыі Віттген

Пачынаем абмяркоўваць новы зямельны кодэкс

Урад БССР разаслаў на месцы ў акругі і раёны для абгаварэньня праект новага зямельнага кодэксу. Сёньня мы пачынаем на старонках нашае газэты падрабязна абмяркоўваць асновы новага зямельнага кодэксу. У бліжэйшыя дні мы зьмесьцім рад артыкулаў, прысьвечаных гэтаму пытаньню. Мы заклікаем усіх рабочых, нізавых працаўнікоў, рабселькораў, калгасьнікаў, сераднякоў і беднякоў прыняць удзел у абмеркаваньні праекту новага кодэксу і прысылаць у рэдакцыю свае заўвагі.

Зараз Народны Камісарыят Земляробства надрукаваў і разаслаў на месцы для абгаварэньня праект новага зямельнага кодэксу БССР у рэдакцыі калегіі Наркамзему.

З апошніх пастаноў партыйных і савецкіх устаноў працоўныя БССР добра ведаюць аб усіх тых клясавых скрыўленьнях, якія мелі месца ў практычнай працы Народнага Камісарыяту Земляробства.

Аднадушная пастанова верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б права-ўхілісцкая—кулацкая палітыка ў мінулым Народнага Камісарыяту Земляробства была рашуча асуджана. Зразумела, што кулацкая палітыка, якая праводзілася Наркамземам у практычнай працы на працягу цэлага раду гадоў, цягнула за сабой выданьне адпаведных цыркуляраў, якія на сутнасьці скрыўлялі тыя асноўныя ўстаноўкі нашай зямельнай палітыкі, якую праводзіла камуністычная партыя Беларусі.

Новы зямельны кодэкс, які зараз разасланы на месцы для абгаварэньня сярод шырокіх колаў працоўных, распрацаваны на падставе дырэктыў Саюзнага закону асноўных прынцыпаў зямлякарыстаньня і зямляўпарадкаваньня і ставіць адной з сваіх задач рашучую перабудову дробных адзінасабовых сялянскіх гаспадарак у буйныя сацыялістычныя гаспадаркі; стварае ўсе падставы для гэтага і дае рад палёгкаў бядняцка-серадняцкім колам вёскі выйсьці як мага хутчэй на шлях буйнога сацыялістычнага земляробства. У гэтых мэтах новы зямельны кодэкс БССР амаль што цалкам распрацаваны нанава, паасобныя разьдзелы і артыкулы, якія не адпавядаюць мэтавай устаноўцы партыі і Савецкай улады ў справе ўмацаньня сацыялістычнага наступленьня на кулака, зразумела, выкрэсьлены зусім. Тое, што здабыта, як вопыт, у справе працы па разгортваньні калгаснага будаўніцтва, прызнана патрэбным і неабходным да выданьню гэтай вялікай праробленай працы, таксама карэнным чынам перароблена структура самога кодэксу.

Замест таго, што ў старым зямельным кодэксе справе калектывізацыі адводзілася толькі некалькі паасобных артыкулаў, новы зямельны кодэкс, як кажучы ўжо тым, **што ён цалкам ад пачатку да канца зьяўляецца кодэксам забясьпечваючым узмоцнены рух шырокіх** колаў працоўнага сялянства перабудовай сваёй гаспадаркі ў буйную сацыялістычную, амаль палова артыкулаў адводзіцца пытаньням справы калектывізацыі. Зусім зразумела і выразна новы зямельны кодэкс ставіць пытаньні аб зямляўпарадкаваньні—аб тэй сацыяльна-палітычнай задачы, якую партыя і Савецкая ўлада будуць вырашаць праз зямляўпарадкаваньне. Замест стаўкі на хутар, адруб, дробны пасёлак (які па сутнасьці зьяўляецца нічым іншым, як таксама замаскаваным хутарам або адрубам) новы зямельны кодэкс справу зямляўпарадкаваньня падпарадкае выключна тым задачам, якія стаяць у партыі і савецкай улады ў галіне перабудовы вёскі на новых калектыўных падставах.

Зямляўпарадкаваньне паводле новага зямельнага кодэксу павінна стаць: **агра - палітычным мерапрыемствам дыктатуры пралетарыяту і павінна праз правільную арганізацыю тэрыторыі ўтварацъ умовы, якія дапамагаюць пашырэньню сацыялістычных формаў зямлякарыстаньня і гаспадаркі, а таксама ўздыму вытворчых сіл бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, іх каапэраваньня і калектывізацыі.**

Новы зямельны кодэкс ставіць задачай рашучае наступленьне на капіталістычныя вёскі праз забарону для кулацкіх гаспадарак здаваць у арэнду зямлю праз увядзеньне жорсткіх умоў наймаемай працы ў кулацкіх гаспадарках, прыстасоўваючы цалкам для кулацка-капіталістычных гаспадарак кодэкс законаў аб працы, забарону і нават крымінальную адказнасьць за карыстаньне вельмі распаўсюджанай на абшарах БССР скрытай наймаемай працы над відам сваяцтва, суседзкай дапамогі, адработкаў і інш.

Новым зямельным кодэксам таксама зусім выразна вырашаецца цэлы рад пытаньняў, якія вынікаюць з праў і абавязкаў зямельных грамад. Меўшая месца блытаніна, якая прыводзіла ў некаторых выпадках да надмены праўорганаў савецкай улады сходам зямельнай грамады, рашуча вырашаецца новым зямельным кодэксам у тым напрамку, што дзейнасьць зямельнай грамады цалкам павінна знаходзіцца пад кіраўніцтвам сельсавету або РВК.

Прыступаючы да абгаварэньня новага зямельнага кодэксу, Народны Камісарыят Земляробства добра сабе ўяўляе, што справа перабудовы сельскай гаспадаркі зьяўляецца справай усіх працоўных як гораду, так і вёскі і таму, выносячы на шырокае абмеркаваньне праект новага зямельнага кодэксу, Народны Камісарыят Земляробства спадзяецца, што новы зямельны кодэкс, прапушчаны праз пралетарскі агонь крытыкі і самакрытыкі, будзе тым зямельным законам, які нам патрэбен для перамогі старых, аджыўшых форм гаспадараньня.

Таму мы заклікаем усе ўстановы і савецкую грамадзкасьць для шырокага ўдзелу ў абмеркаваньні новага зямельнага кодэксу і ўнясеньня практычных прапаноў, якія-б далі магчымасьць сапраўды ў найкарацейшы тэрмін перабудаваць сельскую гаспадарку на сацыялістычны лад.

РАЧЫЦКІ.

Праграма лесазагатовак павялічваецца на 60%

Лесазагатоўкі ў гэтым годзе трэба паставіць ня толькі як гаспадарчую, але і як палітычную кампанію

КАНЦЭНТРАЦЫЯ ВЯРБОЎКІ РАБСІЛЫ ДЛЯ ЛЕСАЗАГАТОВАК У РУКАХ НАРКАМПРАЦЫ ПАВІННА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПРАВІЛЬНАЕ РЭГУЛЯВАНЬНЕ РЫНКУ ПРАЦЫ

У мінулым годзе на Беларусі мы мелі вялікую лесазагатовак—вытворчая праграма па загатоўцы дроў была выканана ўсяго толькі на 55 проц. Такое вялізнае недавыкананьне пляну тлумачылася рознымі прычынамі—неарганізаванасьцю рынку рабсілы (які ня быў сканцэнтраваны ў адных руках), вялаецю лесазагатоўчага апарату, позьнім адводам лесасек і невыстарчальным забесьпячэньнем лесарубаў.

У гэтым годзе мы ні ў якім выпадку ня можам дапусьціць зрыву лесазагатовак, зьвязаных з выкананьнем пляну капітальных работ, з выкананьнем экспартных заданьняў і з забесьпячэньнем дрывамі рабочага насельніцтва. І таму мы з самага пачатку павінны завастрыць увагу на лесазагатоўках і пільна сачыць за тым, каб не паўтаралися леташнія промахі.

Уся работа па вярбоўцы рабсілы для лесазагатовак у гэтым годзе перайшла ў рукі Наркампрацы, з якім Лесбел (адзіны лесазагатоўчы орган у Беларусі, за выключэньнем чыгунак) ужо заключыў дагавор. Але гэтага мала—для таго, каб вярбоўка рабсілы была поўнасьцю сканцэнтравана ў адных руках, чыгункі МБЖ і Заходняя, якім дана права лесазагатовак на тэрыторыі БССР, павінны таксама заключыць такі-ж дагавор з Наркампрацы.

Наркампрацы-ж, прымаючы пад увагу, што забесьпячэньне рабсілай зьяўляецца самым важным момантам для посьпеху лесазагатовак, павінен добра ўлічыць усю адказнасьць ускладзенай на яго задачы і моцна націскаць на сваіх акруговых упоўнаважаных і агентаў па вярбоўцы рабсілы.

У бесьнерабойным забесьпячэньнем лесазагатовак хлеба-фуражом можна, відавочна, не сумняваецца—склады Лесбелу поўныя і недахвату тут не прадбачыцца, але аднаго хлеба мала—Наркамгандаль і Белкаапсаюз павінны зараз-жа паклапаціцца аб забесьпячэньні лесарубаў прадметамі спажываньня—гарбатай, цукрам, салам, алеем. Што-ж датычыць забесьпячэньня мануфактурай, то Лесбел ужо накіраваў 10 вагонаў з мануфактурай у лесазагатоўчыя раёны, дзе лесарубы будуць яе атрымліваць з капэрацыйных крам на квітках Лесбелу.

У мінулым годзе лесазагатоўчыя арганізацыі дапускалі пры найманьні рабочай сілы скрыўленьне клясавай лініі, часта аддаючы перавагу больш заможным элемэнтам вёскі ў страту бедняком і батраком. **У гэтым годзе, калі наём рабочай сілы для лесазагатовак канцэнтруецца ў адных руках Наркампрацы, можна не сумнявацца ў тым, што клясавая лінія будзе праводзіцца правільна і што ў першую чаргу будуць прыцягнуты да работы бядняцкія элемэнты вёскі.**

Цяпер аб лесасеках. Праўда, гадавыя лесасекі ў гэтым годзе адведзены Лесбелу свячасова, але за тое звышкаштарысныя лесасекі (пераважна з дубовымі і альховымі насаджэньнямі) у большасьці выпадкаў яшчэ не адведзены і гэта можа затармазіць ход лесазагатовак. А таму Наркамзему неабходна зараз-жа паклапаціцца аб узмацненьні свайго тэхнічнага апарату на мясцох, у мэтах паскарэньня адводу гэтых лесасек.

Посьпеху лесазагатовак павінна таксама паслужыць некаторая мэханізацыя работ, якая Лесбелам упяршыню ўводзіцца ў гэтым годзе. Лесбелам ужо атрымана 10 маторных піл (заказаных у Нямеччыне) і ў хуткім часе чакаецца атрыманьне яшчэ 10 такіх-жа піл. Адкрыты спэцыяльныя курсы матарыстых, якія будуць працаваць з гэтымі пілами. Трэба сказаць, што маторныя пілы павялічваюць прадукцыйнасьць працы ў 4-5 раз. Прымаючы пад увагу пастанову Савету Працы і Абароны аб водпуску 400 трактараў для патрэб лясной прамысловасьці, Лесбел заявіў у Маскве патрабаваньне на 10 трактараў, якія па іх атрыманьні будуць скарыстаны падвойным чынам. У зімовы час трактары будуць вывозіць лес, а з вясны будуць скарыстаны ў якасьці рухавікоў да заказаных перасовачных шпалярэзных варштатаў (прадукцыя Цюменскага машына-будаўнічага заводу). Гэтыя шпала-рэзныя варштаты за рабочы дзень (8 гадзін) даюць 750 шпал—паскарэньне расьпілоўкі шпал атрымліваецца вялізнае.

Але галоўнае, што патрэбна—гэта канцэнтраваньне грамадзкай увагі вакол лесазагатовак. Лесазагатоўкі, вытворчая праграма якіх у гэтым годзе павялічана на 60 проц., трэба паставіць ня толькі як гаспадарчую, але і як палітычную кампанію.

Сацыялістычнае спаборніцтва трэба распаўсюдзіць таксама і на лесазагатоўкі—спаборніцтвам павінны быць ахоплены асобныя лясныя вучасткі і асобныя лесарубачныя арцелі. Прарабы абавязаны ставіць даклады аб ходзе лесазагатовак на пленумах сельсаветаў і райвыканкомаў, у мэтах шырокага азнаямленьня насельніцтва са значэньнем поўнага выкананьня вытворчай праграмы па лесазагатоўках, у прыватнасьці выкананьня экспартных заданьняў.

Л. Н—даў.

За што зьнята з працы настаўніца Крыкунова

На працягу 4-х год настаўніца Новікаўскай школы, Бабруйскага сельсавету, **Крыкунова**, дзякуючы сваёй чужой ідэалёгіі і цеснай сувязі з заможнікамі, **займалася шкоднаю работаю, перашкаджала працы сельсавету, імкнулася скампрамэтаваць членаў сельсавету, стаць на чале кіраўніцтва сельсаветам і ніяк ня ажывалася з бяднацка-серадняцкай часткай сялянства в. Новікі.**

Настаўніца **Крыкунова** імкнулася ўсялякімі мерамі **падрываць работу гуртка па ліквідацыі няпісьменнасьці**, называючы гурток «шайкай» і «частной лавочкой», не дазволіла праводзіць заняткі ў школе. Настаўніца **Крыкунова адмовілася праводзіць клясавую лінію ў школе**, выклікаўшы гэтым абурэньне сярод беднаты. Яна прапанавала ўнесьці ўсім вучням па 50 кап. на апал школы, а калі ёй прапанавалі прапаўніік сельсавету з беднаты ўзяць менш, а з заможных больш, дык Крыкунова адказала: **«калі вы праводзіце нейкую клясавую лінію сярод сялян, дык я сярод вучняў ніякай клясавай лініі праводзіць ня буду, усе павінны ўнесьці аднолькава».** І тыя вучні, якія ня прынесілі па 50 кап., не дапускаліся ў школу.

Актыўны ўдзел у агіднай працы настаўніцы прымаў муж яе **Пудан**, настаўнік Мазырскага падтэхнікуму, які часта вазмяняў Крыкунову і праводзіў свае шкодную ідэалёгію на вёсцы. Так, напрыклад, 10 сакавіка г.г. на сходзе сялян у Бабруйскім сельсавеце на дакладу старшыні сельска-гаспадарчага таварыства аб падніцыі ўраджайнасьці **Пудан** выступае са сваёй тэорыяй: **«Калектывы сябе не апраўдалі, толькі трацяць дзяржаўныя сродкі, лепш падымаць сельскую гаспадарку асобных сялян». Заможнікі-ж у адказ крычалі — «правільна».**

У выніку ўсяго гэтага, агульныя сходы беднаты і прэзыдыум сельсавету пачалі выносіць пастановы аб зьняцьці настаўніцы Крыкуновай з школьнай працы.

Але настаўніца Крыкунова не здае сваёй пазыцыі. Ёй напляваць на пастановы сходаў беднаты, прэзыдыуму сельсавету і цэлага раду камісій (бюро скаргаў, калегіі РСІ, саюзу працасьветы і камісіі па чыстцы савецкага апарату), якія, высьвятляючы ўсю агідную і шкодную працу, якую праводзіла настаўніца, канстатавалі правільнасьць патрабаваньняў беднаты аб зьняцьці з працы настаўніцы.

Крыкунова стварае дэлегацыю вучняў, ходайнічаць за тое, каб пакінулі яе ў школе. Ёй удаецца сабраць подпісы некаторых сялян, у большай частцы заможных. Між іншым, сярод подпісаў фігуруюць нават подпісы 10-11-гадовых вучняў.

З усім гэтым матар'ялам, заявамі і подпісамі, пасьля яе звальненьня, **Крыкунова** зварачаецца ў рэдакцыю газэты «Зьвязда» за дапамогай.

Бюро расьсьледваньня рэдакцыі газэты «Зьвязда» паслала свайго прадстаўніка ўсебакова высьветліць на месцы прычыны звальненьня Крыкуновай.

16-га кастрычніка ў чаўверты раз быў скліканы сход беднаты ў вёсцы **Новікі** з удзелам прадстаўніка рэдакцыі газэты «Зьвязда» і Мазырскай АКК-РСІ. Яшчэ да пачатку сходу зьявілася шмат сялян і сялянак са свімі скаргамі на настаўніцу. **Але і настаўніца не драмала. Яна са сваім мужам Пуданам падрыхтавала, як належыць, заможнікаў, разьмяркоўваючы паміж імі ролі. Крыкунова зьявілася на сход толькі тады, калі на сход нейкім чынам трапілі заможнікі — не прыхільнікі.**

На гэтым сходзе вельмі добра пацьвярдзіліся ўсе агідныя і шкодныя ўчынкі настаўніцы («праца» супроць сельсавету і грамадзкіх арганізацый вёскі, пасылка сялян у горад па гарэлку для пладжаньня гульняў, антысэміцкія выбрыкі, напрыклад, пасьля звальненьня яна гаворыць вучням — «мяне з работы зьнялі, і вас будзе вучыць цяпер жыдоўка»).

Цікава таксама ахарактарызаваць некаторых асоб, якія выступалі ў абарону Крыкуновай. **Палтаўшчанка** — вясковая абартыстка, якая калечыла жанчын, за што сядзела 2 гады ў папраўчым доме, **Гутляк**, муж якое сядзіць у Менскім папраўчым доме за контр-рэвалюцыйную дзейнасьць, **Карповіч**, царкоўны старэста, **Лазоўскі Сьцяпан**, кулак, які інкнуўся ўсялякімі спосабамі сарваць гэты сход.

У заключэньне, калі дайшлі да рэзалюцыі, настаўніца **Крыкунова** замест таго, каб прызнаць сваю віну, «абамлела». **Заможнікі прабавалі сарваць сход, пагражаючы кулакамі, а некаторыя нават ня былі супроць тушыць лямпу.**

Гэта зьявішча не дало магчымасьці давесьці сход да канца, але ўсё-ж такі гэты сход з поўнай відавочнасьцю выявіў твар настаўніцы. Выкрыта ўся агідная і шкодная ёй праца, што ў апошні раз пацьвярджае правільнасьць зьняцьця яе з школьнай працы.

Як выконваюцца дырэктывы VIII зьезду прафсаюзаў

Выхаваўчая праца з новымі рабочымі вядзецца дрэнна

„Без пагардлівых адносін да новых кадраў рабочых—выхадцаў з вёскі—прафсаюзы павінны цярпліва, па-таварыску і сыстэматычна выхаваць у іх сьвядомыя адносіны да сацыялістычнае фабрыкі, прымаць усе меры да павышэньня іх культурнага ўзроўню.“

(З пастановы VIII зьезду прафсаюзаў)

Надта дрэнна выконваюць прафсаюзныя арганізацыі на вёсцы дырэктыву аб падрыхтоўцы прафактыву. **Праф'ячэйкі нават ня ведаюць, нагo пічыць актывам.** Так, на заводзе імя Халтурына (Рагачоў) актывам лічаць усіх рабочых, якія маюць якую-небудзь нагрузку і працуюць у грамадзкіх арганізацыях. Такім чынам, у актыў мэханічна залічаны ўсе рабочыя заводу. Зразумела, што пры такім становішчы **зусім адсутнічае выхаваньне актыву.** На заводзе «Ільліч» лічыцца 70 чалавек прафактыву. А калі старшыня заўкому паведаміў аб гэтым на сходзе рабочых, падняўся вялікі сьмех. На заводзе «Камінтэрн» і фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» склікалі за апошні год на дзьве нарады актыву і супакоіліся. На фабрыцы «Спартак» ніякай работы з актывам не праводзіцца і вучот яго адсутнічае. Такое-ж становішча і ва ўсіх агледжаных саўгасах і рабачкомах саюзу СГЛР, а таксама ў большасьці агледжаных праф'ячэек саюзу працасьветы, мэдсанпрацы і саўгандальслужачых. З усіх гэтых прафарганізацый паведамленьні надта кароткія: «работы з актывам няма, аб выхаваньні новага актыву ніхто ня думае», або «прафактыў самастойна вучыцца, але саюзныя арганізацыі гэтым ня цікавяцца».

Аб тым, што гэтую справу можна наладзіць, сьведчыць тое, што **асобныя праф'ячэйкі здолелі арганізаваць падрыхтоўку і вучобу прафактыву.** Так, прафарганізацыі Клімавіцкага раёну з'арганізавалі міжсаюзную школу праф-граматы, у якой заняткі вядуцца рэгулярна. Для прапрацоўкі больш важных пытаньняў склікаюцца нарады прафактыву. Асабліва **зьвернута ўвага** на выхаваньне і прыцягненьне да актыўнага ўдзелу ў прафработе новага прафактыву. У выніку гэтага асобныя прафактывістыя прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі калгасаў, мэліярацыйных таварыстваў і г. д.

Усё-ж трэба адзначыць, што наступ выхаваньне прафактыву пастаўлена дрэнна. За гэту работу павінны ўзяцца прафарганізацыі на вёсцы і ўсё-ж такі

РАБОТА З СЭЗОНЬНІКАМІ, АДПУСКНІКАМІ І З НОВЫМІ КАДРАМІ РАБОЧЫХ

Гэта работа асабліва патрэбна ў прадпрыемствах, якія знаходзяцца ў сельскіх мясцовасьцях, дзе працуе новая рабочая сіла, праходзіць амаль што выключна за кошт вёскі. Новыя рабочыя часта прыносяць самыя дрэнныя настроі адсталай часткі сялянства і нават кулацкіх элемэнтаў.

Так, на заводзе «Камінтэрн» каля 20 проц. рабочых маюць сваю ўласную сельскую гаспадарку. Частка іх скарыстоўвае свае заработкі на заводзе для сваіх гаспадарак, якія ў асобных выпадках пераходзяць у кулацкія. Заўком выявіў два такія выпадкі і паставіў на абгаварэньне сходу рабочых. А сход пастанавіў выключыць кулакоў з саюзу і зьняць іх з работы. Былі яшчэ выпадкі, калі два рабочыя, якія жывуць у вёсцы і маюць там свае гаспадаркі, агітавалі супроць калектывізацыі. Уся бяда ў тым, што **прафарганізацыі зусім не вядуць сыстэматычнай работы па вывучэньні складу і пахаджэньня рабочых і членаў саюзаў.** Гэтае становішча не дае магчымасьці саюзам правільна пабудаваць сваю работу сярод асобных пластоў работых. Толькі на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» гэта работа праводзілася пры ўдзеле групы прафактыву, але толькі ў адносінах да новых рабочых, прынятых у 1929 годзе. Там-жа пачала праводзіцца асобная работа па выхаваньні новага складу рабочых. Праводзіліся асобныя сходы рабочых, сыстэматычныя гутаркі з імі аб розьніцы паміж капіталістычнымі і савецкімі прадпрыемствамі, аб ролі і задачах прафсаюзаў і г. д.

На іншых прадпрыемствах **работа з новымі кадрамі рабочых ня толькі не разгорнута, але і не пачыналася.** А ў выніку гэтага, напрыклад, на заводзе «Ільліч» ёсьць група старых рабочых, якія зьвязаны паміж сабою сваяцтвам і ў сваё асяродзішча зусім ня хочуць прымаць новых рабочых. Яны

Нарады ўдзельнікаў брыгад не праводзіліся. Улік іх працы на ўсіх прадпрыемствах адсутнічае. **Адміністрацыя мала дапамагала ў рабоце брыгад.** Таму ня прыходзіцца зьдзіўляцца, што індывідуальным спаборніцтвам ахоплена толькі 15 чалавек. Ролю ўдарных брыгад у разгортваньні работы па спаборніцтве прафарганізацыі недаацанілі.

Усё-ж, ня гледзячы на недастатковае растлумачэньне сутнасьці спаборніцтва прафесыянальнымі арганізацыямі і слабое кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі, у перадавой частцы рабочых спаборніцтва знайшло сабе прытулак і дало належныя вынікі.

Вынік працы спаборніцтва характарызуецца наступнымі дасягненьнямі: павялічылася прадукцыйнасьць працы на фабрыцы «Спартак» на 26,5%, на заводзе «Лекерта»—26 проц., на Хлебазаводзе—24,4 проц., цукерні—20,1 проц., пабудова фабрыкі штучнага валакна і гарбарні—15,46, «Росмасдоры»—17, служ ба цягі—24,4 проц. Перавыканалі дагавары: фабрыка «Спартак»—на 13,5%, завод «Лекерта»—8 проц., хлебазавод—1, цукерня—на 10,1 і г. д., але разам з гэтым ёсьць і такія, якія ня выканалі пляну: завод «Баранцьба»—26 проц. і Клімавіцкі сілікатны завод—3 проц.

Значна **зьнізіліся прагулы** па няўважлівых прычынах.

На цэлым радзе прадпрыемстваў **рабочыя добраахвотна зьнізілі расцэнкі** і павысілі нормы выпрацоўкі. На заводзе «Лекерта» 55 чал. зьнізілі расцэнку на 5 проц., на заводзе «Адралжэньне» 16 чал. ад 5 да 7 проц. Заработная плата ў іх ня зьменшылася, на цукерачнай фабрыцы 57 чал. павысілі ад 5 да 17 проц., на заводзе «Пралетары» 40 чал.—да 10 проц.

Праца з вылучэньнем лепшых рабочых для прэміяваньня пастаўлена дрэнна.

На трубатрадзе вылучана 150 чалавек, але-ж кандыдатур для прэміяваньня яшчэ не абгаварылі. На пабудове фабрыкі штучнага валакна вылучана 500 чалавек, але абгавораных для прэміяваньня толькі 45 чалавек.

Лепш справа на фабрыцы «Спартак» дзе вылучылі 145 чал. для прэміяваньня, як лепшых удзельнікаў у вытворчасьці і за добры ўдзел і дапамогу ў спаборніцтве дырэктар фабрыкі, мэханік і бухгальтар прадстаўлены для прэміяваньня.

Іншыя прадпрыемствы зусім нічога не зрабілі ў гэтым напрамку.

Нарэшце, трэба зазначыць, што **вылучаныя таварышы да праверкі дагавораў** таксама аднесьліся пасыўна. Ня ўсе яны зьвярнулі належную ўвагу на праверку і нала наведвалі прадпрыемствы, да якіх яны былі прымацаваны. Асобныя брыгадзіры наведалі прадпрыемствы толькі 1—2 разы.

А. СЯНЬКЕВІЧ.

ПРАВЕРКА ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ ДАГАВАРОЎ

Ударныя брыгады---баявая форма ўдзелу рабочых у сацыялістычным спаборніцтве

Слабае кіраўніцтва прафарганізацый тармозіць работу ударных брыгад

Скарыстаем праверку сацдагавароў і падрыхтоўку да зьезду ударнікаў для узмацненьня ударных брыгад

Вынікі спаборніцтва 19-ці прадпрыемстваў

Магілеўскае акрпрафбюро скончыла праверку выкананьня сацдагавароў па 19 прадпрыемствах округі.

Праведка паказала, што на растлумачэньне сутнасьці спаборніцтва сярод рабочых аказалі ня ўсе, а некаторыя ФЗМК вельмі мала зварачалі ўвагі, а некаторыя ФЗМК зусім не зьвярталі і пляліся ў хвасьце, не жадаючы кіраваць (завод «Ільліч»).

Сходы асобных груп рабочых праводзіліся толькі на фабрыцы «Спартак»—адзін сход прагульшчыкаў з іх жонкамі. На некаторых прадпрыемствах праведзены сходы моладзі. Больш ніякай работы сярод асобных груп рабочых не праводзілася. **А дзякуючы слабой растлумачальнай працы былі выпадкі неразуменьня і нават нежаданьня ўступаць у сацспаборніцтва.**

Так, напрыклад, на фабрыцы «Спартак» загадчык вытворчасьцю **Рубенін** на сходзе заявіў: **фабрыка і так даволі нагружана, а таму ня трэба весьці сацспаборніцтва».**

Яшчэ больш ганебны выпадак быў на заводзе «Адралжэньне». Калі брыгадзіры зьявіліся да бухгальтара з просьбай даць лічбовыя весткі аб ходзе сацспаборніцтва, то апошні ня толькі гэтых вестак ня даў, а нават груба вылаяўся. А старшыня ФЗМК нават зусім не зьявіўся на сход, на якім абгаварваліся вынікі сацспаборніцтва. Таксама зрабіў і кіраўнік заводу. **Вытворчая-ж камісія да сацспаборніцтва адносіцца зусім нядбайна, напляваецьскі.** Гэта яшчэ раз сьведчыць аб тым, што саюзы сацспаборніцтвам цікавіліся мала і кіравалі ім дрэнна.

Насьцепгаазэты ў большасьці выпадкаў і ня думалі аб спаборніцтве. Ход самога спаборніцтва таксама асьвятляўся дрэнна.

Да спаборніцтва добра аднеслася толькі частка рабочых, якая і дасягнула добрых вынікаў.

На правераных 19 прадпрыемствах заключана дагавароў—234, з іх: агульных 222 і індывідуальных—15. 11 дагавароў заключаны з прадпрыемствамі іншых акруг.

Асноўныя недахопы гэтых дагавароў заключаюцца ў тым, **што ня былі вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы.** У большасьці дагавароў былі толькі агульныя фразы.

Кепская справа і з арганізацыяй ударных брыгад, якіх было арганізавана толькі 17, з абхопам 157 чалавек.

Фабрыка «Спартак», якая налічвае каля 600 чалавек рабочых, мае 1 брыгаду з лікам 9 рабочых. Чыгунка—1 брыгаду з 3 чалавек, «Росмослор»—4 брыгады з 45 чалавек, або 7,5 проц. да агульнага ліку рабочых.

На чыгунцы ўдарная брыгада зараз зусім распалася. А на заводзе «Ільліч», ня гледячы на тое, што ня было дагавароў спаборніцтва, **брыгады арганізаваліся і рабочыя паміма заўкому арганізавалі спаборніцтва.**

Добруское „кіраўніцтва“

Адміністрацыя будаўнічае арганізацыі ў Добрушы надумала цікавы мэтад удзелу ў сац. спаборніцтве. Даведаўшыся аб тым, што рабочыя абавязаліся па сац. дагаворы падняць прадукцыйнасьць працы на 8 проц., адміністратары, не пераглядзеўшы норм і расцэнак, пачалі вылічваць з агульнага заработку рабочых 8 проц.

Прыезд брыгады ЦСПСВ па праверцы выкананьня сацдагавору ўскалыхнуў рабочых. Арганізавалася ўдарная брыгада з 12 чал., якая абавязалася падняць прадукцыйнасьць працы на 20%, зьнізіць расцэнкі — на 5 проц. і выклікала на гэта іншых рабочых. Супроць такога важнага пачынаньня выступілі не кулакі, якія, магчыма, залезьлі ў рабочы калектыў і не адсталыя рабочыя, а... сакратар ячэйкі, прадстаўнік прафсаюзу і гаспадарнік.

Сакратар ячэйкі КП(б)Б на сходзе рабочых выступіў з наступнай прамовай — на што брацца падымаць прадукцыйнасьць працы на 20 проц. Гэта-ж застанецца на паперы. Лепш узяцца падняць на 5 проц. і выканаць цалкам. Ударная брыгада нічога не дасягне, нам трэба націснуць на ўсіх рабочых, каб усе былі ўдарнікамі..., а прадстаўнік прафсаюзу будаўнікоў т. **Шломік** нават дайшоў да такога глупства, што заявіў: «Калі вы зараз можаце падняць прадукцыйнасьць працы на 20 проц., то гэта азначае, што вы раней гультаявалі, а не працавалі». Загадчык «Энэргбуду» т. **Горбах** таксама не адстаў ад сваіх папярэдніх. Ён сказаў, што «каб ведаў, што тут будзе ісьці гутарка аб нейкіх 12 чал. рабочых, зусім на сход ня прышоў-бы».

Толькі прысутнасьць на сходзе брыгадзіра ЦСПСВ т. Юдоўскага дала магчымасьць не дапусьціць, каб кіраўнікі-галавацяпы адгаварылі перадавых рабочых ад праўдзеньня сваёй ініцыятывы ў правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва.

Неабходна, каб Гомельскі АК КП(б)Б і АПБ прынялі самыя тэрміновыя меры да зьнішчэньня такіх шкодных мэтадаў «садзейнічаньня» сац. спаборніцтву і паказалі-б месца галавацяпам, што зарваліся.

М. Ш.

Дагавор застаўся пустой паперкай

На заводзе **«Камінтэрн»** у Нова-Барысаве брыгады па праверцы выкананьня сацдагавароў закончылі сваю работу і зараз-жа вынікі абгаворваюцца на агульных вымеавых сходах.

Вынікі праверкі гаворацъ аб тым, што вытворчую праграму па лесапільным цэху выканалі з перавышэньнем на 2 проц.; па фанэрным недавыканалі на 1,3 проц.

Прадукцыйнасьць працы па лесапільным цэху падняласа на 10 проц. супроць мінулага году (па сацдагавору было прадугледжана 17 проц.), недавыканалі па сацдагаворы на 7 проц.

Зьніжэньне сабекошту па лесапільным цэху 4,48 проц. (па сацдагаворы было прадугледжана 7 проц.), недавыканалі 2,52 проц.

Такія-ж паказальнікі і па фанэрным цэху.

Вялікі ўплыў на ход спаборніцтва мелі прастоі варштатаў, напр.: па адным лесапільным аддзяленьні за час спаборніцтва было 156 гадз. прастояў з-за несвячасовай падачы сырцу да варштатаў і адсутнасьці тэхматар'ялаў.

На фанэрным цэху за ўвесь гаспадарчы год было 133 гадзіны прастояў, а разам 289 гадз. У перавозе на дні гэта складае 36 дзён, або паўтара месяца за год вытворчай працы вылецела. Бязумоўна, гэтыя рабочыя працавалі на другіх работах, але-ж на больш нізкіх кваліфікацый, а заработную плату атрымлівалі па сярэднім заработку.

Дзе-ж хаваюцца прычыны такога зьявішча, як невыкананьне ўзятых на сябе абавязкаў рабочымі; справа ў тым, што заўком не кіраваў сацспаборніцтвам; культкамісія за час спаборніцтва не прывяла ні адной гутаркі ў цэху, не растлумачылі рабочым сутнасьці спаборніцтва; ня ўсе рабочыя зразумелі задачы на вытворчасьці ў час спаборніцтва. Заўком не падтрымаў ініцыятывы групы рабочых у ліку 22 асоб, жадаючых арганізаваць у паказальную брыгаду; яна распалася з прычыны таго, што частка рабочых з гэтай групы патрабавала новых варштатаў.

Адміністрацыя набюракратычнаму аднёсілася да зьяўвак рабочых аб зьнішчэньні недахопаў, што выклікаюць прастоі. Да гэтага часу ня выканана шмат пастаноў вытворчых камісій і нарад, выкананьне якіх зьменшыла-б прастоі варштатаў. Агульны сход рабочых, заслухаўшы вынікі праверкі, патрабаваў большай адказнасьці ад адміністрацыі за гаспадарчае кіраўніцтва і патрабаваў зараз-жа выканаць пастановы вытворчых камісій і прапановы рабочых. Прыцягнуць да адказнасьці вінаватых за зрыў спаборніцтва. Прэміяваць лепшых рабочых, якія супраўды сумленна і добра выконвалі свае абавязкі. Заўкому прапанавана перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі, якія зараз стаяць перад прафсаюзамі; адначасова рабочыя далі абяцаньне, што яны прапушчанае ў гэтым годзе нагоняць у 1930 годзе.

СІПЧАНКА.

Дапамагаць ініцыятыве мас

(Гута імя Камінтэрну, Бабруйскае акругі)

Пачатак працы нашага заводу пасьля рамонту нельга назваць адвальнічым. Адміністрацыя гуты і Шклатрэст зусім мала цікавіліся зьнішчэньнем недахопаў вытворчасьці. Як прыклад, адміністрацыя заводу скамплектавала варштаты так, што іх трэба было пераўкамплектоўваць ў часе працы, а гэта ўносіла ў работу перабой і шкодзіла выпуску прадукцыі. З боку часткі рабочых таксама адчуваўся некаторы халадок. Яны зусім не клапаціліся аб паляпшэньні працы, зьмяншэньні процанту глуму, прагулаў і г. д. Гэта адчувалася ў пачатку працы пасьля рамонту.

Зараз-жа заводзкія арганізацыі павялі рашучую барацьбу з гэтымі ўсімі зьявішчамі. Дзякуючы гэтаму, мы зараз бачым, што і спаборніцтва ўжо разгарнулася досыць шырока.

Паасобныя варштаты заключаюць між сабою дагавары на павялічэньне прадукцыйнасьці працы, зьмяншэньне глуму, бою, ліквідацыю прагулаў і інш. Заключэньне гэтых дагавароў набыло такі шырокі масавы характар, што заўком не спраўляецца іх афармляць. Ужо ў першыя дні працы тых варштатаў, якія заключылі сац. дагавары, павялічылася выпрацоўка, зьменшыўся глум і зусім ліквідаваны прагулы. Масавая зацікаўленасьць спаборніцтвам апраўдала сябе ў поўнай меры. Тыя варштаты, якія яшчэ ў спаборніцтва ня ўступілі, зараз рыхтуюцца да гэтага. У спаборніцтва уступаюць нават асобныя зьмены ў маштабе цэху. Толькі яшчэ слабавата ўцягнуты ў сацспаборніцтва падсобныя цэхі, але і яны зараз ужо выклікаюць адзін другога на сацспаборніцтва і можна сьмела сказаць, што цэхі таксама будуць ахоплены сацспаборніцтвам.

Трэба адзначыць, што шклатрэст зусім не прыстасаваўся да таго, каб дапамагаць энтузіязму рабочых і сацыялістычнаму спаборніцтву. Рабочая ініцыятыва часта мінае галовы нашых гаспадарнікоў з Шклатрэсту і не атрымлівае належнай дапамогі з боку тэхнічных сіл.

Рабочыя і работніцы робяць усё магчымае, каб выканаць прамфінплян, але-ж Ш

Падрыхтуем кадры чырвоных лётнікаў

Адной з задач Асоавіяхіму зьяўляецца камплектаваньне школ лётнікаў моладзьдзю. Падбор кандыдатаў, якія зусім адпавядаюць па сваім сацыяльным пахаджэньні, адукацыі і фізычным разьвіцьці—справа цяжкая і адказная. Яна можа быць выканана толькі пры поўнай увазе з боку асоавіяхімаўскіх арганізацый і пры непасрэднай дапамозе хамсамолу і прафсаюзаў.

Нельга не адзначыць, што да апошняга часу гэта работа праводзіцца, галоўным чынам, акрасветамі Асоавіяхіму, нізавыя-ж ячэйкі і райсаветы ў большасьці сталі ў баку. Адгэтуль працоўная моладзь слаба інфармавана аб наборах, якія праводзяцца, аб умовах паступленьня, вучобе і г. д. З другога боку, гэта пасьпяшасьць нізавых арганізацый адбіваецца на чыстаце сацыяльнага адбору кандыдатаў.

Райсаветы і ячэйкі павінны належным чынам узяцца за работу па ўкамплектаваньні авіяшкол, выкарыстоўваючы для папулярызацыі гэтага пытаньня сходы пасьлішч, прадпрыемстваў і ўстаноў, зьмяшчаючы адпаведны матар'ял у насьценгазэтах. Ячэйкі павінны ўсімі мерамі дапамагаць усім, хто хоча паступіць у авіяшколы, у іх вучобе шляхам арганізацыі спэцыяльных груп і гурткоў самападрыхтоўкі. Нарэшце, трэба ўжыць рад мер, каб у лік кандыдатаў ня трапіў непрапоўны элемэнт. Таму трэба шырока прыцягваць да абгаварэньня кандыдатур усю масу асоавіяхімаўцаў.

Набор кандыдатаў адбываецца чатыры разы ў год. У вайскова-тэарытычную школу, якая падрыхтоўвае лётнікаў, набор адбываецца ў летні і зімовы пэрыяды, у вайскова-тэхнічную школу, якая падрыхтоўвае авіяцыйных тэхнікаў—у вясеньні і асеньні пэрыяды.

Чарговы набор кандыдатаў будзе рабіцца ў вайскова-тэарытычную школу ў лістападзе месяцы гэтага году. БССР прадастаўлена 100 месц, якія ўжо разьмеркаваны па акруговых арганізацыях Асоавіяхіму.

Усе, хто жадае паступіць у школу, павінны падаць заяву ў сваю акруговую арганізацыю Асоавіяхіму. Умовы паступленьня наступныя: **Узрост—18-25 год, трэба быць зусім здаровым, мець адукацыю ня ніжэй сямігодкі.** Да заявы трэба дадаць дакуманты аб сацыяльным становішчы, адносіны да вайсковай службы, і, пажадана мець камандыроўку ад партыйнай, камсамольскай, або прафсаюзнай арганізацыі. Перавага будзе давацца асобам, якія знаёмы з якім-небудзь рамяством — такарным, сьлясарным і інш., або з рухавікамі ўнутранога згараньня.

Кандыдаты, адабранымі камісіямі Асоавіяхіму, накіроўваюцца па вайсковым літары ў вайскова-адборачныя камісіі, што знаходзяцца ў БССР—у Віцебску і Гомелі. Там зараз-жа (у часе работы камісіі) кандыдаты разьмяшчаюцца пры якой-небудзь вайсковай часьці і залічваюцца на чырвонаармейскі паёк.

Кандыдаты, якія прызнаны нягодным вайскова-адборачнай камісіяй, накіроўваюцца на месца свайго жыхарства таксама за кошт Ваенведу.

Праезд кандыдатаў, што прыяжджаюць з раёнаў у першапачатковую асоавіяхімаўскую камісію, і харчаваньне іх робіцца за свой кошт.

Кандыдаты, прынятыя вайскова-адборачнымі камісіямі, накіроўваюцца ў авіяшколу ў Ленінград, дзе адбываецца канчатковы адборны цэнтральнай вайскова-адборачнай камісіі.

Усе курсанты ў школе знаходзяцца на поўным утрыманьні Ваенведу (харчаваньне, абмундыраваньне і аклад пэнсіі—3 руб. 80 кап. у месяц). Пры пераходзе слухачоў з вайскова-тэарытычнай школы ў лётную школу, яны будуць атрымліваць да 70 рублёў у месяц.

Вайскова-тэарытычная школа дае тэарытычную падрыхтоўку для будучых лётнікаў. Яна мае два курсы: курс сухаземных лётнікаў з тэрмінам навучаньня ў паўтара гады, і курс марскіх лётнікаў з тэрмінам навучаньня 14 з палов. месяцаў. Навучаньне палётам і баявая падрыхтоўка адбываецца ў вайскова-лётных школах, куды і пасылаюцца ўсе курсанты, што з посьпехам скончылі вайскова-тэарытычную школу. Тэрмін навучаньня ў вайсковай школе лётнікаў паўтара гады.

Вучні, што скончылі вайсковую школу лётнікаў, атрымліваюць годнасьць камандыра РСЧА і вайскова-лётніка і назначаюцца ў страявыя часьці ВПС на пасады малодшых лётнікаў з акладам пэнсіі 140 руб. у месяц.

Вайсковыя лётнікі маюць права паступіць ва ўсе вайсковыя акадэміі РСЧА.

Дабіцца стопроцантнага ахопу сялянства пазыкай

Прэзыдыум Усесаюзнага Цэнтральнага Савету Прафэсіянальных Саюзаў зьвярнуўся да ўсіх рабочых, да ўсіх прафарганізацый СССР з адозвай наконт падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

— Кантрольная лічба па пазыцы,—гаворыць ў адозьве,—ужо перавыкананa. Рабочыя заводу «Дынамо» зьвярнуліся да ўраду з пістом, у якім патрабуюць павялічэньня сумы пазыкі на 250 мільёнаў рублёў.

Пралетары Савецкага Саюзу бліскучай падпіскай яшчэ раз і яшчэ раз пацьвердзілі сваю гатоўнасьць змагацца за ажыцьцяўленьне вялікага пяцігадоваго пляну.

— Пасьпяхова праводзячы падпіску ў горадзе і прамысловых цэнтрах, рабочыя і служачыя, пад кіраўніцтвам сваіх арганізацый, павінны ўдзяліць максымум увагі распаўсюджваньню пазыкі сярод шырокіх бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

УсеЦСПС заклікае ўсіх рабочых і служачых, усе прафарганізацыі да шырокай агітацыі сярод сялян, да растлумачэньня ім значэньня пазыкі. Трэба арганізоўваць гутаркі, праводзіць мітынгі, накіроўваць рабочыя брыгады на вёску, дамагацца 100-проц. ахопу сялян падпіскай.

У заключэньне ў адозьве зазначаецца, што абавязак кожнага члена прафсаюзу—не дапускаць датэрміновага продажу або закладу пазык.

ЦК чыгуначнікаў аб падзеях на Аршанскім вузьле

Прэзыдыум Цэнтральнага Камітэту саюзу чыгуначнікаў СССР абгаварыў чытаньне аб шкодніцтве на Аршанскім чыгуначным вузьле. Прэзыдыум ЦК прапанаваў старшыні Дарпрафсожу МБВ чыг. неадкладна выехаць асабіста ў Воршу і прыняць удзел у поўным і дэталёвым расьсьледваньні справы.

Прэзыдыум прапанаваў старшыні Дарпрафсожу мабілізаваць рабочых вузла супроць шкодніцтва і дабіцца ў самы кароткі тэрмін пералому ў рабоце і ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Прафэсыянальныя арганізацыі не павінны спыняцца перад неакладным выключэньнем з радоў рабочых і саюзу ворага-кулацкіх элемэнтаў і шкоднікаў.

Шкоднік Масаловіч выключаны з камсамолу

21-га кастрычніка на ст. Ворша адбыўся агульны сход членаў ячэйкі ЛКСМБ службы цягі. Сход дэталёва абгаварыў пытаньне аб шкодніцкіх учынках камсамольца сьлесара дэпо А. Масаловіча, аб якіх своячасова паведамлялася ў «Зьвязьдзе». Масаловіч, замест таго, каб, як сьвядомы рабочы, уважліва і сур'ёзна адносіцца да даручанай яму працы па рамонце цягніка, врабіў афёру, замазаў шчыліны цягніка сурыкам. Яму дапамагаў у гэтым рабочы Рыгор Кірылкін.

Агульны сход прызнаў, што ўчынкі Масаловіча і Кірылкіна іграюць на руку клясаваму ворагу, які імкнецца сарваць сацыялістычнае спаборніцтва, скампрамэтаваць рабочую моладзь, што напружвае ўсе свае сілы, каб выканаць задачы партыі і савецкае ўлады.

Сход рашуча асудзіў учынкі Масаловіча і Кірылкіна і пастанавіў: выключыць Масаловіча з радоў камсамолу, патрабаваць ад адміністрацыі вучастку звальненьня шкоднікаў з вытворчасьці і выключэньня з прафсаюзу, перадаць справу ў суд і прасіць сьледчыя органы правесьці паказальны суд у чугуначным клюбе ст. Ворша.

Агульны сход адзначыў, што злачынства Масаловіча абгаворвалася на цэхавым сходзе камсамольцаў службы цягі, але цэхавы сход прымірэнча аднёсься да злачынства. Сход асуджае памылку, дапушчаную камсамольцамі цэху.

Хлебазагатоўкі

СКЛАДЫ І ТАРУ—ДЛЯ ХЛЕБАЗАГАТОВАК

Зварот урадавай камісіі і Наркамгандпю да працоўных БССР

Улічваючы ўскладзенае ўрадам і партыяй на хлебазагатоўнаў выкананьне гадавога пляну хлебазагатовак у працу першага паўгодзьдзя і вынікаючыя адгэтуль цяжкасьці ў справе хаваньня гэтага хлеба, урадавая камісія і Наркамгандпю БССР зварочваюцца да ўсіх выканкомаў, гаспадарчых, дзяржаўных і каапэрацыйных установаў, грамадзкіх арганізацый і працоўных БССР прыйсьці на дапамогу хлебазагатоўцам у справе адшуканьня складаў, зьбіраньня тары і брэзэнтаў.

Урадавая камісія і Наркамгандпю зварочваюцца да ўсіх працоўных і асабліва да камсамолу (лёгкая кавалерыя) з просьбай паведамляць мясцовым газетам, якія склады выкарыстоўваюцца немэтазгодна, а таксама аб памяшканьнях, якія могуць быць скарыстаны для захаваньня хлеба.

Усе ўстановы, прадпрыемствы і арганізацыі павінны зрабіць усе захады да аслабаненьня мяхоў, якія ў іх маюцца, і здачы іх неадкладна Саюзхлебу.

Разам з савецкімі, каапэрацыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі, кожны грамадзянін БССР павінен адгукнуцца на гэты заклік і здаць усе мяхі, якія ён мае, за ўстаноўленую плату.

Урадавая камісія і Наркамгандпю ўскладаюць на Саюзхлеб арганізацыю паўсюднага зьбіраньня мяхоў ад насельніцтва, робячы за іх разьлікі з здатчыкамі, пачынку і неадкладную дастаўку гэтых мяхоў на хлебазагатоўчыя пункты.

Сіламі савецкай грамадзкасьці, сьвядомымі адносінамі кожнага грамадзянина БССР да справы дапамогі хлебазагатоўкам, тэхнічныя цяжкасьці, якія сустракаюцца на шляху разьвіцьця хлебазагатовак, будуць зьнішчаны, і асноўнае заданьне ўраду і партыі — будзе выканана.

3.000 мяшкоў валяюцца на Добрускай фабрыцы

Па вестках старшыні Добрускага гарсавету, на фабрыцы «Гэрой Працы» ляжыць 3.000 мяшкоў. Загатоўчыя арганізацыі аб гэтым ведаюць, але ніякіх мер ня прымаюць, каб купіць гэтыя мяшкі.

Выяўлены новыя склады для хлеба

За апошнія дні ўрадавай камісіяй выяўлен яшчэ рад новых складаў, годных для хаваньня 400 тысяч пудоў хлеба.

На сёньнішні дзень ужо ёсьць складаў, годных для харчаваньня 5 мільёнаў 100 тысяч пудоў хлеба. Ужо разгарнуўся збор тары ў Полацку, Віцебску і Гомелі.

У Воршы выпучаны спэцыяльныя рабочыя брыгады для выяўленьня складаў і тары.

Урадавая камісія накіравала ў пракуратуру рад, спраў аб арганізацыях, якія ня выконваюць распараджэньняў урадавай камісіі. Так, напрыклад, прыцягнуты да адказнасьці Бабруйскі акрсаюз і Лесбел за прастой 33 вагонаў. У Менску прыцягнуты да адказнасьці Белдзяржбуд і БСНГ за нявываз грузаў са ст. Менск.

Калгасы павінны выканаць свае абавязкі

Спачатку кампаніі па 11-е кастрычніка КАЛГАСЫ БССР ЗДАЛІ ТОЛЬКІ 781 ТОНУ ХЛЕБАПРАДУКТАЎ, што складае 79,4 проц. таго гадавога заданьня Калгассаюзу, аб недастатковасьці якога ў нашай газэце ўжо пісалася. Калі ўлічыць, як у нас ужо было даведзена, што плян Калгассаюзу паменшаны амаль што ў два разы, трэба сказаць, што ЗДАЧА ЛІШКАЎ КАЛГАСАМІ ПРАХОДЗІЦЬ СЛАБА.

Трэба праверыць кожны калгас у пасобку, выявіць, колькі ён павінен здаць лішкаў і куды ён іх дзяваў. Трэба ўжыць суровыя мерапрыемствы ў адносінах старшынь калгасаў, якія ня выканалі плянаў загатовак.

Узмацніць здачу закантрактаванага хлеба

ПАСТУПІЛА ТОЛЬКІ 17% ЗАДАНЬНЯ

На 10-га кастрычніка па кантрактацыі збожжавых культур паступіла ўсяго 2.257 тон, што складае 17,2 проц. гадавога заданьня.

Такі ніскі процант выкананьня нічым ня можа быць апраўданы.

Трэба адсудзіць апарат сальска-гаспадарчай каапэрацыі, які ня прыняў ніякіх мер для фарсаваньня збору кантрактацыі і дапусьціў становішча, калі ход загатовак значна абагнаў збор закантрактаванага хлеба.

Сельска-гаспадарчая каапэрацыя і мясцовыя арганізацыі нічога не зрабілі, каб скарыстаць актыў і ўсю грамадзкасьць для растлумачэньня сялянству неабходнасьці здачы закантрактаванага збожжа да наступленьня фармальных тэрмінаў. Між тым, невыкананьне збораў па кантрактацыі прадстаўляе сабой вялікую небясьпеку.

У кантрактантаў ствараецца думка, што яны могуць выканаць заданьне ў тыя тэрміны, калі яны захочуць.

Чырвоны абоз з 4.000 пудзбожжа

СТАРОБІН. (Наш кар.). 23-га кастрычніка беднота і сераднякі Чырвонадворскага сельсавету Старобінскага раёну, здалі чырвонымі абозамі 4 тысячы пудоў збожжа.

„Зьвязда" дапамагла

СКАРГА ПІСАРЭНКА БУДЗЕ РАЗГЛЕДЖАНА

У свой час «Зьвязда» пісала аб пяганіне ў судовых і сьледчых органах па спагнаньні грамадзянскага іску з Ціханкова ў карысьць Пісарэнка. Справа цягнулася каля двух год, рабіліся расьсьледваньні, а вынікаў ніякіх.

Пракуратура рэспублікі паведамляе, што ўвесь матар'ял перасланы пракурору Віцебскай акругі і прапанавана яму перадаць справу ў суд для слуханьня, а таксама прасачыць за яе выкананьнем і здавальненьнем грамадзянскага іску ў карысьць Пісарэнка.

ЯЦКОЎ—ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ Ў НК-РСІ

У № 221 газ. «Зьвязда» пісалася, што ст. інспэктар НК-РСІ Яцкоў незаконна карыстаўся зямлёю ў хут. Міхалова і вёў сумесна з братамі кулацкую гаспадарку. Каб плаціць менш падатку, яны фіктыўна падзялілі паміж сабою зямлю.

Расьсьледваньнем паказаныя ў заметцы «Калектыў» бр. Яцковых факты пацьвердзіліся.

Калегія НК-РСІ **пастанавіла зьняць з працы т. Яцкова і забараніць яму працаваць у савецкіх, каапэрацыйных і гаспадарчых установах.**

Даручана пракурору рэспублікі зрабіць сьледзтва і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці за ўтойваньне аб'ектаў абкладаньня і за неабкладаньне гаспадаркі Яцковых у мінулым годзе ў індывідуальным парадку.

Агульны сход супрацоўнікоў НК-РСІ пастанавіў **выключыць т. Яцкова з членаў прафсаюзу.**

АДАБРАНЫ ХУТАР, АБВЕШЧАНА ВЫМОВА

У заметцы «Перагібы» пісалася, што член партыі Нікалаеў дапамагаў бацьку зямляўпарадкаванца на хутары, абыходзячы ўсе законы. Заметка рэдакцыяй пасылалася на расьсьледваньне. Аршанская АКК-РСІ паведамляе, што паказаныя ў заметцы факты пацьвердзіліся. Бюро Мсьціслаўскага РК КП(б)Б **абвясьціла Нікалаеву вымову і адабраны хутар ад яго бацькі.**

У часе чысткі Мсьціслаўскай райпартарганізацыі т. Нікалаеву абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

ГАНДЛЯР ГОЛУБ ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ

Рабкор паведаміў рэдакцыю, што былы гандляр **Голуб** паступіў на працу ў Белдзяржбуд па пратэкцыі. Расьсьледваньнем устаноўлена, што Голуб быў прыняты на працу праз нам. загадчыка Менаддзяленьня Белдзяржбуду т. Левіна. Голуб тры тыдні таму назад **зьняты з працы.**

Звыш 100 мільёнаў на будаўніцтва ў будучым годзе

На агульным сходзе інжынэрна-тэхнічных работнікаў загадчык Белдзяржбуду тав. **Купер** зрабіў даклад аб ходзе будаўніцтва. З дакладу і спрэчак выявілася, што Белдзяржбуд да 1-га кастрычніка выканаў будаўнічыя работы на 80 проц. Гэта дае гарантыю, што плян будаўніцтва трэсту да канца будаўнічага сэзону будзе выкананы поўнасьцю. Асабліва адчуваецца недахват у транспарце, што адбілася і на самым ходзе будаўнічых работ.

Зазначалася на неабходнасьць стварэньня ў будучым такой арганізацыі, якая змагла-б забясьпечыць будаўніцтва гужавым і аўта-транспартам для дастаўкі матар'ялаў да месца работ.

Падкрэслена была станоўчая роля стварэньня пры трэсьце праект-бюро, якое забясьпечвала пабудовы патрэбнымі чарцяжамі. Некаторыя з таварышоў зазначалі на дрэнную пастаноўку тэхнічнага вучоту. Усьцім мала закраналася вельмі важнае пытаньне аб тым, хто будзе выконваць будаўніцтва ў паступным годзе, якое па сваіх разьмерах значна перавысіць сёлетняе будаўніцтва.

Будаўніцтва ў паступным годзе намечана груба арыентыровачна ў суме звыш ста мільёнаў рублёў (мяркуецца 116 мільёнаў рублёў). Пры чым адна прамысловасьць будзе на суму ў 35 мільёнаў рублёў. На жыльлёвае будаўніцтва мае быць затрачана да 18 мільёнаў рублёў.

Будаўнічы плян Белдзяржбуду складае на будучы год 23 мільёны руб.

Белжыльсаюз мяркуе ахапіць усё жыльлёвае будаўніцтва і частку ведамственнага прыкладна на такую суму, што і Белдзяржбуд, Гандльбуд—на 6 мільёнаў рублёў.

Калі выключыць сельска-гаспадарчае будаўніцтва, якое дасягае 20 мільёнаў рублёў, то ўсё-ж такі застанецца не разьмеркаваных будаўнічых работ на суму каля 40 мільёнаў рублёў, якія трэба будзе камусьці выканаць.

Боль чаму паўстае пытаньне аб стварэньні такой будаўнічай арганізацыі (калі немагчыма пашырэньне існуючых), якая-б узяла на сябе выкананьне будаўнічых работ, што яшчэ да гэтага часу ня ўскладзены на іншыя будаўнічыя арганізацыі.

Аб гэтым трэба сур'ёзна падумаць.

КУЛЬКІН.

Дыспут аб пралетарскай літаратуры ў БССР

23-га кастрычніка ў доме Асьветы пачаўся дыспут на тэму «Пралетарская літаратура ў Беларусі», арганізаваны юнсэкцыяй саюзу працасьветы.

Уступнае слова зрабіў загадчык АПАД ЦК КП(б)Б тав. **Сянкевіч.**

У спрэчках выступалі: т. т. **Ігнатоўскі, М. Піотуховіч, М. Зарэцкі, Аляхновіч** і інш.

М. Зарэцкі, ад якога аўдыторыя чакала тлумачэньня сваіх нацыянал-дэмакратычных памылак, выступіў, аднак, з угрупаваньнем так званага «рамантычнага стылю».

Многія з прысутных і выступаўшых зусім правільна бачылі ў гэтым спробу Зарэцкага абараніць «рамантызм» «Крывічоў» і «Голага зьвяра».

З прычыны вялікай колькасьці прамоўцаў, дыспут перанесены на другі вечар.

На дыспуце прысутнічала каля 300 чалавек.

Падрабязная справаздача аб спрэчках будзе падрукавана ў наступным нумары газэты.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Дом Камасьветы імя Карла Маркса. 27-га кастрычніка а 8-й гадзіне ўвечары даклад Белкалгассаюзу для нізавога актыву аб бліжэйшых задачах калектывізацыі. Пасьля дакладу кіно. Уваход па партыйных і камсамольскіх білетах і па білетах Дому.

— У суботу, 26-га кастрычніка, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Фрунзаўскага райкому КП(б)Б сход жаноргаў.

Дом Асьветы. 27-га кастрычніка а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца агульны сход нанова абраных дэлегатак. Яўка абавязкова.

— Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары (Дом Асьветы) пачынаюцца заняткі ў гуртках і палітшколе для тэхнічных працаўнікоў пры яч. ЛКСМБ працасьветы. У палітшколе, акрамя палітычных дысцыплін, будуць выкладацца: матэматыка, белмова і прыродазнаўства.

Просьба да ўсіх загадчыкаў школ, дзіцячых салоў і г. д. запавясьціць аб заняткох у палітшколе тэхнічных работнікаў. Яўка камсамольцаў абавязкова.

— Кастрычнікавы райком КП(б)Б паведамляе, што канфэрэнцыя Асоавіяхіму, прызначаная на 20 кастрычніка гэтага году, пераносіцца на 2-е лістапада.

Нядзельны рабочы ўнівэрсытэт. 27-га кастрычніка, а 10-й гадзіне раніцы ў 41-й аўдыторыі БДУ (Земляробчы заў.) адбудуцца заняткі нядзельнага рабочага унівэрсытэту. Усе даведкі, якія датычаць унівэрсытэту, можна атрымаць у сакратара праўленьня на серадах і суботах з 6—8 гадзін увечары і ў нядзелі з 10—2 гадз. дня, у пакоі № 22 (будынак БДУ). У гэты-ж час могуць падаваць заявы ўсе паступаючыя, але не пазьней, чым да 30 кастрычніка.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

МЕНСК

Падрыхтоўка да ўсебеларускай с.-г. выстаўкі праводзіцца нездавальняюча

Учора ў залі СНК пад старшынством тав. **Галадзеда** адбылося пашыранае пасяджэньне выставачнага камітэту.

Дырэкцыя выстаўкі зрабіла інфармацыю аб ходзе падрыхтоўкі да ўсебеларускай с.-г. і прамысловай выстаўкі.

З спрэчак па дакладу дырэкцыі высьветлілася, што падрыхтоўка да выстаўкі праходзіць вельмі дрэнна. Ня гледзячы на тое, што да адкрыцьця выстаўкі засталося каля 8 месяцаў, яшчэ мала зроблена для яе арганізацыі. Вакол гэтага пытаньня не сканцэнтравана ўвага працоўных мас Беларусі. ВСНГ ня мае нават арыентыровачных плянаў прамысловага сэктару. У падрыхтоўчай рабоце ніякага ўдзелу ня прымаюць інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі і асабліва сэкцыя ІТС пры саюзе будаўнікоў.

Адзіны банк у Віцебскай дасьледча-паказальнай акрузе

СНК згадзіўся з прапановаю НК РСІ аб аб'яднаньні ў адзіны Дзяржаўны Банк Віцебскага аддзяленьня Дзяржаўнага Банку СССР, аддзяленьня Беларускага банку камунальнай гаспадаркі і акруговага т-ва сельска-гаспадарчага крэдыту. Адзіны дзяржаўны банк у Віцебску павінен зьяўляцца філіялам Дзяржаўнага Банку СССР і выконваць наступныя функцыі: кароткатэрміновае крэдытаваньне прамысловасьці, гандлю і каапэрацыі, мэтавае крэдытаваньне сельскай гаспадаркі, жыльлёва-камунальнага будаўніцтва, мясцовай прамысловасьці і г. д. Арганізацыя адзінага банку ў Віцебску павінна быць скончана да 10 лістапада г. г.

За дзень

Дзесяць тысяч рублёў на ясьлі. Прэзыдыум ЦВК БССР даручыў цэнтральнай дзіцячай камісіі выдаць Наркамату Аховы Здароўя датацыю на ўтрыманьне дзіцячых устаноў. Ужо выдана 10 тысяч рублёў на ўтрыманьне ў Менску ясьляй.

Барацьба з бяспрытульнасьцю. Цэнтральная Камісія дапамогі дзецям адпусьціла (ср. інспэктарыяту нарасьветы 800 рублёў на барацьбу з бяспрытульнасьцю ў Менску. З вуліцы ўжо падабрана 50 бяспрытульных, якія разьмеркаваны па дзіцячых установах.

Пабудова дому ўраду

Работы па пабудове дому ўраду ў Менску вядуцца ўзмоцненым тэмпам. На будаўніцтве занята каля 300 рабочых. Канчаецца пабудова фундамантаў. У гэтым сэзоне на будаўніцтва будзе выдаткавана звыш 500 тысяч рублёў. Асабліва шырокія работы разгорнуцца ў новым сэзоне, на іх намячаецца адпусьціць каля 2 мільёнаў 500 тысяч рублёў. Работа будзе весьціся з такім разьлікам, каб скончыць дом ураду да 1-га жніўня 1931 году. Праектам прадугледжваецца пабудова залі пасяджэньняў ЦВК на тысячу чалавек, залі пасяджэньня СНК і Вярхоўнага Суду.

Дом будзе мець у розных частках ад 5 да 9 паверхаў. Будзе абсталявана 12 пад'ёмных машын. Праектуецца таксама пабудова ля галоўнага ўваходу дому ўраду помніку Леніну ў 12 мэтраў вышыні.

Што новага ў эфіры

Праграма перадач Менскай радыёстанцыі

Пятніца, 25-га кастрычніка

17—00—Час пінаграі вучня. 17—40—Сялянскі час. Лекцыя доктара аб паратыфусе. 18—00—Рабоча-Сялянскі Радыё Унівэрсытэт. 19—00—Беларуская радыё-газэта (лат. аддзел). 20—00—Праверка часу. 20—00—Гадзіна прафработніка. 20—25—Перадача на мове эсперанта. 20—40—Інфармацыя ўраду. 21—00—Энтаграфічны канцэрт. 23—00—Азбука Марзэ.

Субота, 26-га кастрычніка

17—00—Пасьпяхабедзены канцэрт. 17—30—Гадзіна абароны краіны і Чырвонай армії. 18—30—На фронце сацыялістычнага будаўніцтва. 19—00—Беларуская радыё-газэта (яўр. аддзел) 20—00—Паверка часу. 20—00—Сялянская вяч рка. 21—00—Канцэрт.

Сёньня, 25 КАСТРЫЧНІКА, а 6-й г. увеч. ў Доме Комуніст. Асьветы — — імя Карла Маркса склікаецца пашырэны — —

СХОД АКТЫВУ Кастрычнікавага раёну,

куды запрашаюцца: бюро ячэек КП(б)Б, бюро ячэек ЛКСМБ, члены ЦП саюзаў, фабзавмясцкомы, кіраўнікі прадпрыемстваў і устаноў, рэдкалегіі насьценгазэт і многатыражных газэт, кіраўнікі дэлегацкіх сходаў, загадчыкі клюбаў і чырвоных куткоў.

Парадак дня: АБ ПЕРАЗАКЛЮЧЭНЬНІ І ПРАВЕРЦЫ КАЛДАГАВАРОЎ.

Білеты—у райкоме

У СУББОТУ, 26 КАСТРЫЧНІКА А 7 ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ

Ў памяшкан. прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук

(рог Ленінскай і Унівэрсытэцкай, другі паверх)

АДБУДЗЕЦЦА

АДКРЫТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

— СЭКЦЫІ ГІСТАРЫЧНАГА МАТАР'ЯЛІЗМУ —

натэдры марксызма-ленінізма БАН.

ПАРАДАК ДНЯ: Даклад С. Я. Вальфсона «Сучасныя рэлігійныя настроі на Беларусі».

Яўка ўсіх членаў сэкцыі абавязкова. Запрашаюцца члены Цэнтр. Сав. Бязбожнікаў і антырэлігійныя актывісты

Гэтыя дняк! Прэм'ера!

мастацкі фільм

РАЗЛОМ

Рэжысэр Леў Замковы. Апэратар Е. Ф. Аляксеў.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Пятніца, 25 кастрычніка Білеты ў касе тэатру ад 12—2 і ад 5 гадз.

Субота, 26 кастрычніка для рабочай моладзі. Білеты ў Доме Камсамолу

Нядзеля, 27 кастрычніка для кваправ. арцелей і саматужн.-адзіночак. Білеты ў Менаддз. Белсампрамсаюзу

П. Бергельсон

ГЛУХІ

Пачатак спэктакляў роўна а 8 з пал. гадз.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Амэрыканская камэдыя ў 6 частках. **З 1-м КРАСАВІКОМ** Звыш праграмы—культурфільм у 3-х частках **ПАЛЯВАНЬНЕ на ГАРЫЛУ** Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал — Амэрыканскі баявік **РАДЫЁ І ЛЕЎ** Звыш праграмы: хроніка „Совкино" № 57 Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО Пралетары — Новы фільм вытв. „Совкіно" **КАІН І АРЦЕМ** жыльцёвая драма ў 6 частках. Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкіно" № 54 Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — **СЭРЦА АЗІІ** (Аўганістан) Кіно-нарыс у 6 частках. Звыш праграмы цікавая камэдыя **ЯНКА ПІЯНЭР** у 1 частцы Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і серадах ад 12 гадз. дня.

КІНО Спартак — ГАСТРОЛІ сатырыка-юмарыстага **Льва БРАУНА** у новым арыгінальным рэпэртуары НА ЭКРАНЕ—амэрыканскі баявік **ЭЛЕКТРЫЧНАЕ КРЭСЛА** трагэдыя ў 7 частках. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 к.

50 К. Кошт публікацыі аб згубе дакумэнты

ДОВОДИТСЯ ДО СВЕДЕНИЯ, что

ПО ВСЕМ ВОПРОСАМ ЭКСПЛОАТАЦИОННОГО ХАРАКТЕРА

ЗАПАДНЫХ ЖЕЛЕЗН. ДОРОГ

подлежит с 1-го октября 1929 года **ОБРАЩАТЬСЯ в КАЛУГУ,** в правление Западных жел. дорог;

В ГОМЕЛЕ, согласно приказа НКПС, СОЗДАНА

ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ

бывш. правления Западных железных дорог

для ликвидации дел, возникших до 1-го октября 1929 г. и заключения отчетности за прошлый 1928-1929 бюджетный год.

23 октября 1929 г. г. Гомель.

Председатель ликвидкома б. правления Западн. ж. д. Сохань.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАСА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА

Ленінскае, побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-6-

АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч

Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутр. ным, хірургічным, жаночым, зубным, кожна-венэрычным, вуха, горла, носа і скуры

ПРЫМАЮЦЬ ПА ПАПЯРЭДНІМ ЗАПІСЕ

Па хваробах вокан—праф. Камінскі па панядзелках і чацьвяргох ад 3 гадз. дня.

Па хваробах вуха, горла і носа—праф. Бурак—па пятніцах з 3 гадз. дня.

Па жаночых хваробах—праф. Выдрын—па чацьвяргох з 7 гадз. увеч.

Па хірург. хваробах—праф. Рубашоў—па пятніцах з 6 гадз. увеч.

Па страўн.-кішэчн.—дацэнт Манасэвіч па аўторках і чацьвяргох ад 8 гадз. увеч.

Па хваробах скуры—д-р Розэнталь па аўтораках і суботах ад 8 г. увеч.

Па ўнутр. хваробах—праф. Мелніх—па чацьвяргох ад 6 г. увеч.

Па ўнутр. хваробах—праф. Гаусман па серадах ад 6 г. увеч.

Па хірург. хваробах—праф. Сакалоўскі—па чацьвяргох ад 6 г. увеч.

Па нэрвовых хваробах—праф. Кроль—па чацьвяргох ад 6 гадз. увеч.

Фізіятрычны габінэт: масаж, электрыка і сьвятло-лячэньне.

Рэнтгенаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых прыёмам хаміна-дантэрмыя, аналізы ў прыём хворых па лекавых, кніжках таварыства.

— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

ЗГУБЛЕНА ПЯЧАТКА

Юнацкай садова-агароднай арцелі «Чырвоны агародзік» Талачынскага раёну, Аршанск. акр. Лічыць несапраўднай

ЗГУБЛЕНА ДАМАВАЯ КНІГА д. № 36 па Савецкай вул. ЖАКТ'у № 16. Лічыць несапраўднай. Знайшоўшага просьба зьвярнуць па адрасе: Савецкая, 36, кв. 13, Крэйніну.

Беларуская к-ра акц. т-ва

„САЮЗХЛЕБ" і БЕЛКААПСАЮЗ

абвяшчаюць для ведама ўсіх устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый і ўсіх грамадзян, што

ПРЫЁМКА МЯХОЎ за плату

ПА УСТАНОЎЛЕНЫХ ЦЭНАХ

ВЫТВАРАЕЦЦА ва ўсіх пунктах Саюзхлебу і каапэрацыйных крамах, складах і пунктах.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Асабовая картка Старавойтава Ц. Е., выд. Чавуск. РВК. 972

Асабовая картка Лазаркова Л. Я., выд. Чавуск. РВК. 973

Вучотная картка Пуцькова С. І., выд. Чавуск. РВК. 974

Вучотная картка Цімошчанка С. Е., выд. Чавуск. РВК. 975

Чырвонаарм. кніжка Рашатнева К. П., выд. 97 палком. 976

Чырвонаарм. кніжка Кошнерава Ф. І., выд. Клімавіц. РВК. 977

Служб. кніжка № 3149 Ветошка Я., выд. Барэзінск. РВК. 978

Служб. кніжка № 1720 Шыка В. І., выд. Барэзінск. РВК. 979

Кніжка на кармленьне дзіцяці Мартыненка А. В., выд. Барысаўск. страхкасай. 980

Пашпарт Счасновіча В. А., выд. Лепельскай міліцыяй. 981

Асабов. кніжка Багдановіча П. Г., выд. Лепельск. РВК. 982

Мэтрычны выпіс, членскі білет саюзу хаміна Кішык М. 983

Чырвонаармейск. кніжка Тарасава А. П., выд. 97 палком. 984

100 КАРТИН

Подп